№ 24 (382) 25 чэрвеня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Палата засталася палатай**
Адхіленыя папраўкі ў Выбарчы кодэкс.
старонка 2

**Першы**
Вызваленьню Беларусі прысьвячаецца.
старонка 4

**Фядора**
Я табе ў нос цюкну «дзякуй» твой. Рэпартаж зь Пільшычаў, дзе жыве самая моцная знахарка Беларусі.
старонка 8–9

**Ліпень + адрэналін**
Дзе правесьці адпачынак.
старонка 12

**Канстытуцыя Эўропы**
4:1 на карысьць Францыі.
старонка 6

**Вольга Карач**
Самы крохкі палітык «пакаленьня next».
старонка 7

**Як вучыць замежную мову**
Спачатку 7,5 тысяч словаў, пасьля яшчэ 4 тысячы.
старонка 11

**Чым даражэйшае кіно, тым менш свабоды**
Гутарка з клясыкам швэдзкага кіно Янам Труэлем.
старонка 15

# Новы ідал Эўропы



**Нарадзіўся новы Пэле. На першых палосах усіх брытанскіх газэтаў — 18-гадовы бамбардзір зборнай Англіі па футболе Ўэйн Руні. Пасьля «Бітлз» гэта другое дзіця Лівэрпулю, што мае шанцы скарыць сьвет.**
**Па матчы з Харватыяй, у якім НеRoo забіў два файныя галы, па чатырох галах у выніковым заліку, якія вывелі гэтага фактычна яшчэ пацана ў найлепшыя бамбардзіры Эўра-2004, з Пэле яго параўноўваюць ня толькі газэты, але й капітан ангельцаў Дэвід Бэкхем, зрынуты ідал, якога Руні зацьміў. «Эвэртан» — клюб, у якім гуляе Руні, — ацаніў юнака ў 76 млн эўра. Пацана, які на цырымонію ўручэньня ўзнагароды BBC для маладых адкрыцьцяў году зьявіўся з жуйкай у роце, у майцы на левы бок і гучна шморгаючы. Яго параўноўваюць яшчэ і з Моцартам. Футбол і ідалы — старонка 2.**

РЭКЛЯМА

**Тэрмінова прадаецца**

## працоўны самаходны кормазавод:

**млын-зернедрабілка-міксэр** для вытворчасьці камбікармоў на шасі а/м. МАН 12192, 1993 г.в., прабег 310 тыс. км.;
**агрэгат DAVEKE-GEHL MIX-ALL 170**, малатковы млын і зернедрабілка — магутнасьць 5-6 т/гадз., міксэр корму, аб'ём 2,5 т, бак кармавога масла 500 л (ёсьць магчымасьць упрысквання), вагі-дазатар і самапагрузка кормадабавак.
Пагрузка і разгрузка кармоў — вінтавым альбо пнэўматычным чынам, шнэк да 5 м вышынёй, шлангі 30 м. Матор агрэгата DEUTZ BF619130C, 131 кВт, 17000 мотагадзін, тэхагляд прайшоў у 2004 г.
Кошт 32000 Эўра (дамоўны).
Месца: г.Шаўляй, Літва. Тэлефоны (370) 68779702, (370) 41598091. Кестуціс Макунас E-mail: ruvera@siauliai.omnitel.net





**Апошні дзень падпіскі 25 чэрвеня**

# Балтыка чакае



«Наша Ніва» абвяшчае конкурс для падпісчыкаў. Галоўны прыз пераможцу — адпачынак на Балтыйскім моры.

Дасылайце копіі падпісных абанэмэнтаў на 2-е паўгодзьдзе 2004 году на адрас Рэдакцыі. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. Дасылаць можна й факсам на нумар (017) 284-73-29 або, адсканаваўшы, праз электронную пошту nn@promedia.by.

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта нашмат таньней, чым уразроб.

## Гранітны помнік Быкаву

22 чэрвеня, на гадавіну сьмерці пісьменьніка, ля ягонай магілы лёг гранітны валун зь фінскіх шхераў — адзін з тых суворых шэрых гранітаў, якія так упадабаў Быкаў падчас свайго жыцьця на чужыне. За вечар яго ўкрылі васількі й ружы. Двое ў цывільным не саромеліся фільмаваць усіх, хто прыйшоў ушанаваць памяць пісьменьніка. Гэта ад такіх і такога пісьменьнік-франтавік вымушаны быў правесьці шэсьць год за мяжой.

На знак удзячнасьці за пакупку й прывоз валуна Беларускі ПЭН-Цэнтар прыняў Юку Малінэна, віцэ-прэзыдэнта Фінскага ПЭНу, у ганаровыя сябры беларускага пісьменьніцкага саюзу. Дастаўкай каменя апекаваліся таксама паэт Уладзімер Някляеў, журналістка Алена Лукашэвіч, пісьменьнікі Алесь Пашкевіч і Барыс Пятровіч.

## Новае паляваньне на Ліцэй

Улады далі старт новаму паляваньню на Ліцэй. Так, за апошні тыдзень у Беларускім ПЭН-Цэнтры пабывалі аж тры інспэкцыі — зь міліцыі, падатковай інспэкцыі і Дэпартамэнту фінансавых расьсьледаваньняў Камітэту дзяржкантролю. Іх цікавіла, дзе і як займаюцца ліцэісты, якія, тым часам, цяпер на канікулах, пасьля здачы экзамэнаў экстэрнам (сярэдні бал — дзявятка, на ўсіх паралелях). Як стала вядома, вышук ініцыявала Міністэрства адукацыі, разьюшанае тым, што Ліцэй не разваліўся пасьля забароны.

**Барыс Тумар**

## Адкрыты ліст у падтрымку Хведара Караленкі

Старонка 10.

# Палата засталася палатай

Праект папраў, якія б рабілі выбарчы працэс празрыстым, быў падрыхтаваны летась, але ўнесены на разгляд сэсіі толькі пасьля таго, як дэпутаты У.Парфяновіч, С.Скрабец і В.Фралоў абвесьцілі галадоўку пратэсту. Галадоўка была спыненая за дзень да разгляду папраў у палаце, са спасылкаю на тое, што мэты галадоўкі часткова дасягнутыя.

Вынікі галасаваньня аказаліся прадказальнымі: прапанову «рэспубліканцаў» падтрымалі 8 чалавек, супраць было 71. Ута Цапф, кіраўніца дэлегацыі Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ, якая назірала за абмеркаваньнем у палаце, заявіла, што большасьць аргумэнтаў праціўнікаў папраў не вытрымлівае крытыкі.

Дэпутаты, якія праводзілі 18-дзённую галадоўку, заявілі аб сваім намеры «мяняць падыходы і пераходзіць да іншых мэтадаў працы». Пра гэта 22 чэрвеня на прэс-канфэрэнцыі на пл.Незалежнасьці паведаміў генэрал Фралоў. Ён меў на ўвазе найперш сустрэчу з дэпутатамі 21 ліпеня, на якую ён спадзяецца сабраць «як мага больш людзей».

Акрэдытаваных журналістаў зь незалежных выданьняў, дарэчы, у Дом ураду на абмеркаваньне папраў не пусьцілі.

**Мікола Бугай**




## Як скончаліся вядомыя галадоўкі

Галадоўка — небясьпечная справа, яна можа прывесьці ня толькі да сур'ёзных праблем са здароўем, але і да сьмерці. Яскравы прыклад — галадоўка ірляндзкіх рэвалюцыянэраў у 1981 г. Падчас яе памерлі 10 чалавек. Распачаў пратэст баец IRA і член парлямэнту Бобі Сэндз. У звароце да брытанскіх уладаў яны пісалі: «Толькі гучны голас ірляндзкага народу і грамадзкая думка можа вярнуць прытомнасьць брытанскаму ўраду. Усе мы будзем трымаць галадоўку да сьмерці, пакуль урад ня пойдзе насустрач нашым патрабаваньням аб аднаўленьні статусу палітычных зьняволеных». Тэтчэр не саступіла. 27-гадовы Сэндз памёр на 66-ы дзень. Найбольш пратрымаўся Кіеран Доэрці — 73 дні, найменш — Марцін Харсан, 46 дзён. 14 байцоў IRA выжылі. Лоўрэнс Макгоўн правёў бязь ежы 70 дзён, астатнія — 20—60 дзён.

Чатыры разы на дзень перад імі ставілі талеркі зь ежаю. Галадоўнікі вярталі яе некранутаю. Адміністрацыя вязьніцы не карміла іх прымусова, пасьля таго як аднаму з ірляндцаў зондам быў пашкоджаны страўнік і той памёр.

У СССР галадоўкі пачалі прыносіць вынікі толькі падчас перабудовы. Падчас галадоўкі ў Чыстопальскай турме 8 сьнежня 1986 году памёр Анатоль Марчанка. Ён галадаў са жніўня, патрабуючы вызваленьня ўсіх палітычных вязьняў. І ягоная сьмерць не была марнаю: у лістападзе былі вызваленыя зьняволеныя па палітычных матывах жанчыны. Падчас апошняй галадоўкі Андрэя Сахарава яму патэлефанаваў сам Гарбачоў...

Не заўжды галадоўкі былі сумленнымі: узімку 1986 г. савецкая тэлевізія праз дзень дэманстравала сюжэты з Лафает-парку насупраць Белага дому, дзе доктар Марцін Гайдэр 218 дзён галадаваў у намёце супраць гонкі ўзбраеньняў. Дарэчы, дзясяткі 74-гадовы Гайдэр памёр у доме састарэлых.

**Алег Раявец,**
**Руслан Равяка**

# Новы ідал Эўропы



Калі Руні дападае да мяча, застаецца толькі сачыць і захапляцца.

Як і Пэле, Уэйн Руні вырас у беднай сям'і. Ягоны бацька — чарнарабочы, маці — кухарка ў школе. Калі дыетэтык «Эвэртону» спытаўся ў спадарыні Руні, ці правільна харчуецца ейны сынок, тая сказала: «Яму нічога не бракуе. Ямо і каўбасу, і чыпсы, і фасолю». Выглядае Руні як адзін з фанаў, што адставіў пузыр зь півам, аддаў фрэнду патрымаць флаг і выскачыў на поле. На твар ён як хуліган.

Брытанскі таблёід «The Sun», аналяг нашае «Камсамолкі», абяцае шчодрую ўзнагароду ўсім, хто прынясе ў рэдакцыю пікантныя факты з жыцьця футбаліста, якога раней ніхто ня ведаў. Да газэты былі прыкладзены… знакамітыя вушы Руні, вырабленыя з паперы, якія можна замацаваць на галаве. Але ніхто нічога асаблівага не паведаміў. Уэйн увесь час «ходзіць» з сваёй першай дзяўчынай. Гаворыць ён на такім дзікім жаргоне, што цяжка вылучыць нават выклічнікі. І ён — фанат футболу. Самастойна ці ў сэкцыі трэніраваўся ўвесь вольны ад заняткаў у школе час.

Чарговы супэргерой сучаснасьці, увесь розум якога ў нагах? Часта гавораць, што спартоўцу лішні розум толькі шкодзіць: тады падчас гульні занадта «парышся». Ёсьць іншае меркаваньне: у выпадку генія, і EuRoo тут не выключэньне, мозг працуе на недасяжных для звычайнага чалавека абаротах. Але гэта мозг практыка, а не тэарэтыка. Калі Руні здаваў на правы, на тэорыі ён валіўся, а практыку ваджэньня здаў пасьля трох заняткаў.

Моцарт быў нязносным для навакольных, зломкам ва ўсім, акрамя музыкі. «Божа, навошта ты абдарыў талентам такую нікчэмнасьць?» — гэткія словы ўклаў у вусны Сальеры Мілаш Форман. Але акурат Моцартам захаплялася ўся Эўропа. І якраз Моцарт працаваў дзень і ноч, маючы пакліканьне.

Калі Ўэйн Руні дападае да мяча, застаецца толькі сачыць і захапляцца. Гары Лінэкер сказаў пра яго: «Мусіць, лепшага брытанскага футбаліста я ў сваім жыцьці не пабачу».

**Франц Субель**

# Што будзе з Іракам пасьля 30 чэрвеня

**30 чэрвеня ўладу ў Багдадзе мае пераняць Часовы ўрад. Паўстане дэмакратычны Ірак ці ён распадзецца на этнаканфэсійныя дзяржавы? Камэнтуе ўсходазнаўца Сяргей Прытыцкі.**

Радыкальныя шыіцкія групоўкі ваююць. Суніцкія арганізацыі супраціўляюцца й спрабуюць аднавіць сваю традыцыйную ўладу над усёй краінай. Курды імкнуцца, дзякуючы сваім вайсковым фармаваньням, захаваць уласную квазідзяржаву. Усе яны ўздымаюць штандар дэмакратыі. Адно што дэмакратыю разумеюць як панаваньне большасьці і бясправе меншасьці. Шматгадовы карэспандэнт «Вашынгтон Пост» у рэгіёне Джонатан Рэндал некалі тлумачыў, што праблема Іраку палягае ў тым, што ўсе тут вядуць гульню толькі на круглыя сумы — усё альбо нічога. Альбо ты маеш уладу цалкам, альбо ня маеш яе зусім. Ты ні з кім ня дзелішся і з табой ніхто ня дзеліцца.

Працяг на старонцы 6.

## Дзяўчыначка 40-га памеру



**Вольгу Карач у Віцебску пазнаюць на вуліцы, у бальніцах і паліклініках абслугоўваюць з падвойным стараньнем: калі флюараграфія, дык хай будуць два здымкі, калі лекі — самыя лепшыя! Аднойчы на дэпутацкі прыём нават прывялі хворага з просьбай яго вылечыць. Вольга — самы прыгожы палітык 2002 году паводле журналісцкага апытаньня і адзін з самых супярэчлівых палітыкаў апазыцыі.**

Працяг на старонцы 7.

### Прэзэнтацыя ў 5-м вагоне

**Выйшаў новы нумар часопісу сучаснага мастацтва «Партызан», прысьвечаны Менску — Гораду Сонца. Прэзэнтацыя пачнецца 24 чэрвеня ў 5-м вагоне электрычкі «Менск—Маладэчна», што адпраўляецца з станцыі «Менск-Пасажырскі» ў 15.22, а прачнецца ў Зялёным (станцыя «Зялёнае»), на лужку. Адбудзецца акустычны канцэрт «Гарацкіх», пэрформансы й г.д. Ахвотным прыняць удзел — мець пры сабе парасон, выпіўку і закуску. Збор удзельнікаў у 15.05 каля вагону.**

# У космас на гадзінку



21 чэрвеня распачалася эра касьмічнага турызму. 62-гадовы амэрыканскі лётчык Майкл Мэлвіл выпрабаваў ракетаплян «Спэйс шып-1», сканструяваны для турыстычных вандровак у космас. Апарат выйшаў за межы атмасфэры, а пасьля пачаў плаўна зьніжацца. Палёт доўжыўся 87 хвілін. На Зямлі пілёта чакала жонка Салі. На здымку: Мэлвілы разьвітваюцца перад палётам.

**СМ**

НАВІНЫ

### Рег «Астра» ad «Pall Mall»

Гарадзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» і British American Tobacco (BAT) падпісалі пратакол пра супольную вытворчасьць цыгарэтаў. Праект пачнецца да канца году на сыравіне BAT і абсталяваньні фабрыкі. BAT выпускае 300 марак, сярод іх Lucky Strike, Kent, Dunhill, Pall Mall.

### Спадарожнікавае БТ

Ствараецца спадарожнікавы канал «Беларусь-ТВ». Вяшчаць ён чамусьці мае парасейску.

### Бывайце, старыя пашпарты

Пашпарты СССР узору 1974 г. і незалежнай Беларусі з «Пагоняй» узору 1993 г. з 1 ліпеня будуць лічыцца нядзейснымі.

### Самая старая наркадылерка

У хаце 80-гадовай жыхаркі вёскі Лістапады на Валожыншчыне знойдзена 3 кг 200 г высушанай макавай саломкі. Вядзецца сьледзтва.

### Кудзіненка ў Маскве

18 траўня фільмам Квэнтына Таранціна «Забіць Біла-2» адкрыўся XXVI Міжнародны Маскоўскі кінафэстываль. Упершыню на фэсьце зьявіўся новы конкурс для маладых рэжысэраў «Пэрспэктывы». На ім свой фільм «Акупацыя», забаронены для дэманстрацыі ў Беларусі, мае паказаць рэжысэр Андрэй Кудзіненка.

### Асьлюк — першы ў Трыесьце

Рэжысэр Віктар Асьлюк атрымаў першы прыз на V кінафэстывалі кароткамэтражных фільмаў «Maremetraggio-2004» у Трыесьце (Італія). Узнагароду атрымаў фільм «Кола».

### Спадчына Быкава

Часопіс «Дзеяслоў» працягвае друкаваць невядомыя творы Васіля Быкава апошніх гадоў. У чарговым, 10-м нумары часопісу — тры прыпавесьці й гумарыстычнае апавяданьне «Інтэграцыя».

### Конкурс маладых музыкаў

У Менску распачаўся Конкурс маладых музыкаў «Muzzone-драйв». Ладзяцца асобныя конкурсы для гітарыстаў, басгітарыстаў, клявішнікаў, бубначоў. Фіналістам будзе дадзена магчымасьць запісаць свае творы ў прафэсійнай студыі. Праслухоўваньне адбываецца ў салёне «Muzzone» (Лагойскі тракт, 10) у нядзелі. Умовы — на сайце www.muzzone.by.

### Новы скандал у Літве

Перад другім турам прэзыдэнцкіх выбараў у Літве Служба спэцыяльных вышукаўператрэсла офісы партый, што падтрымліваюць Валдаса Адамкуса. На думку лідэра кансэрватараў Вітаўтаса Ландсбэргіса, спэцслужбы зьдзейсьнілі «акт палітычнага тэрору»: «Іх рукамі Расея, якой не ўдалося ўтрымаць пры ўладзе Паксаса, намагаецца разыграць сваю апошнюю карту». Ён намякае на прарасейскія пазыцыі суперніцы Адамкуса, Казімеры Прунскенэ, і Партыі працы Віктара Ўспаскіх, што разьлічвае перамагчы на парлямэнцкіх выбарах.

**СМ; БелаПАН, радыё «Свабода», gazeta.pl**

ПОБАЧ СУСЕДЗІ

### Аральны сэкс і ўкраінскі акцэнт

Украінская рада па тэлебачаньні забараніла Новаму каналу жывую трансьляцыю расейскага ток-шоў «Вокны», пасьля таго як у адной праграме выступіла жанчына, якая скардзілася, што моцны ўкраінскі акцэнт замінаў ёй жыць у Расеі. Хвалілася, што знайшла выйсьце: дыкцыю паправілі рэгулярныя заняткі аральным сэксам. Цяпер расейцы ўжо прымаюць яе за сваю. Удзельнікі перадачы пры гэтым назвалі ўкраінцаў «хахламі». Нягледзячы на перапросіны каналу, рада палічыла, што такія перадачы для Ўкраіны недапушчальныя.

# Кожны чацьверты?

**60 гадоў прайшло пасьля вайны, а гісторыкі яшчэ ня ведаюць, колькі ж беларусаў загінула. Ня могуць зьлічыць ці проста ўлада не зацікаўленая?**

Кожны чацьвёрты беларус загінуў у вайне, лічылася ў савецкі час. Кожны трэці — кажа цяперашні афіцыёз. Сьледам за «лініяй партыі» вагаюцца й даведачныя выданьні. Так, «Беларуская гістарычная энцыклапэдыя» (т.2, 1994) у артыкуле «Вялікая айчынная вайна» называе лічбу ў «2,2 млн чал. (кожны чацьвёрты)», а «Беларуская энцыклапэдыя» (т.4, 1997) ужо абыходзіцца без канкрэтных лічбаў: «На Беларусі загінуў амаль кожны 3-і яе жыхар».

Гісторыкі даюць толькі прыблізныя зьвесткі, атрыманыя аналітычным шляхам. Чаму? «Пра пэўныя лічбы можна будзе гаварыць, калі выйдуць усе кнігі сэрыі «Памяць». Пакуль жа ёсьць толькі розныя вэрсіі», — кажа гісторык генэрал-маёр Віктар Шомадзі.

Першыя падлікі стратаў сярод насельніцтва Беларусі пачалі весьці партызаны ў 1942 г. «У лютым 1942 г. быў зварот беларускіх дзеячоў (Якуб Колас, Янка Купала, Заір Азгур, Ларыса Александроўская, Панцеляймон Панамарэнка й інш.) пра генацыд беларускіх дзяцей і падлеткаў. Зварот быў накіраваны ў Міжнародны Чырвоны Крыж, у Жэнэву. Там былі першыя згадкі пра страты сярод мірнага насельніцтва», — кажа навуковы сакратар Нацыянальнага архіву Яўген Бараноўскі. У 1943 г. Беларускі штаб партызанскага руху рыхтаваў справаздачы ня толькі для беларускіх дзяржаўных органаў, але й для агульнасаюзных.

Дакладныя ж падлікі стратаў пачалася па вайне. Створаная ў Маскве Камісія па выяўленьні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на захопленых тэрыторыях і камісіі садзейнічаньня ў Менску ды абласных цэнтрах працавалі ў 1945—1946 г. У выніку былі падлічаны страты сярод мірнага насельніцтва (1 млн 409 тыс. чал.), ваеннапалонных (810 тыс.), а таксама колькасьць вывезеных на прымусовыя работы ў Нямеччыну (380 тыс.). Сярод мірных стратаў амаль 30% складалі дзеці й падлеткі. «Статыстыка ў савецкі час заўсёды была прэрагатывай саюзных дзяржаўных органаў: яны распрацоўвалі мэтодыку. Мясцовыя органы выконвалі іх праграму», — распавядае Я.Бараноўскі.

У 1965 г., калі рыхтаваліся сьвяткаваць 20-годзьдзе Перамогі, да людзкіх стратаў часоў вайны дадалі загінулых партызанаў — яшчэ 45 тыс. чал. Так падвялі агульную лічбу — 2 млн 265 тыс. палеглых. Ад 9 млн 115 тыс. перадваеннага насельніцтва выходзіў акурат кожны чацьвёрты жыхар Беларусі (25%). Аднак гэтая лічба была вельмі ўмоўнай, бо нідзе не вылучалася лічба франтавых стратаў. І сёньня гісторыкі ня могуць нават з дакладнасьцю сказаць, ці ў лічбу стратаў сярод мірнага насельніцтва ўключаліся франтавыя ахвяры, ці не.

Пры канцы 80-х у СССР пачаўся перападлік агульнай лічбы ахвяраў: у савецкі час афіцыйныя гісторыкі заніжалі лічбы франтавых ахвяраў, каб не было ясна, што шлях да перамогі савецкія военачальнікі высьцелілі трупамі і што нямецкія франтавыя страты былі нашмат меншымі. Тады генэрал Валкагонаў назваў лічбу 27 млн. Я.Бараноўскі адзначае, што на падлік людзкіх стратаў у Беларусі гэтая рэвізія істотна не паўплывала, але дапускае памылкі ў падліках 1945—1946 г. на 150—200 тыс. чал. «Напрыклад, вядома, што ў Трасьцянцы загінула 209 тыс. Некаторыя дасьледчыкі сёньня пішуць, што загінула 500 тыс. Але ж у Менску на пачатку акупацыі было зарэгістравана 150 тыс. насельніцтва, а пры вызваленьні — 102 тыс. (гэта афіцыйна зарэгістравана). Дык што, там чатыры Менскі ляжаць? У гарбачоўскі час перагледаліся толькі страты ва Ўзброеных Сілах. Гэтыя зьвесткі захоўваюцца ў архіве Ўзброеных Сіл у Падольску. Мы іх ня бачылі: беларускаму дасьледчыку складана трапіць туды. Лічбы людзкіх ахвяраў на тэрыторыі Беларусі не падвяргаліся сумневу й перагляду».

У Беларусі перападлік пачаўся пасьля распаду Савецкага Саюзу. Незалежная Беларусь узялася за стварэньне поўнага сьпісу ахвяраў. Пры канцы 90-х з ініцыятывы Міністэрства абароны была створана адмысловая камісія па падліку людзкіх стратаў Беларусі ў часе другой сусьветнай вайны. У чэрвені 2001 г. камісія вырашыла даць лічбы, якія пацьвярджаюцца архіўнымі зьвесткамі. «Мы захавалі ўсе ранейшыя лічбы, дадалі толькі вайскоўцаў, што загінулі за пэрыяд 1941—1944 г. Гэтыя лічбы нам дапамог атрымаць Інстытут гісторыі», — кажа Я.Бараноўскі. Да ранейшых 2 млн 265 тыс. дадаліся 332 тыс. воінаў Узброеных Сіл, якія загінулі ў баях на тэрыторыі Беларусі. Разам выйшла 2 млн 600 тыс. чал. — гэтая лічба ўвайшла і ў энцыклапэдыі. Але зноў жа гаворка пра воінаў Чырвонай арміі, якія загінулі на тэрыторыі Беларусі. Колькі ж ураджэнцаў Беларусі загінула ў 1941—1945 г. у Беларусі і за яе межамі — падлікаў няма.



**Лічба 2 мільёны 265 тысяч чалавек і лічба 2 мільёны 600 тысяч чалавек прыблізна ацэньваюць колькасьць людзей, што загінулі на тэрыторыі Беларусі, але ня колькасьць ахвяраў сярод ураджэнцаў Беларусі.**

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

В.Шомадзі пайшоў яшчэ далей. Паводле ягонай вэрсіі, агучанай нядаўна на навукова-практычнай канфэрэнцыі «Навечна ў памяці народнай», палеглых жыхароў Беларусі налічваецца 2 млн 963 тыс. чал. Ад даваеннай колькасьці насельніцтва — акурат кожны трэці. Зрэшты, сам навуковец называе выведзеную лічбу толькі гіпатэтычнай.

Дык кожны трэці альбо кожны чацьвёрты? Магчыма, і кожны пяты!

Бо і лічба 2 мільёны 265 тысяч чалавек, і лічба 2 мільёны 600 тысяч чалавек прыблізна ацэньваюць колькасьць людзей, што загінулі на тэрыторыі Беларусі, але ня колькасьць ахвяраў сярод ураджэнцаў Беларусі. Між тым сярод ваеннапалонных, што загінулі на тэрыторыі Беларусі, ураджэнцаў Беларусі было няшмат — іх у 1941 г. распусьцілі па дамах. У той жа час ніхто не падлічваў, колькі ўраджэнцаў Беларусі, што трапілі ў палон, загінула на тэрыторыі іншых краінаў — ва Ўкраіне, Польшчы і г.д., а такіх нямала.

У лік ахвяраў не ўвайшлі і сябры Самаахові, Самапомачы й іншых падобных арганізацыяў: яны, мауляў, не ваявалі за савецкую ўладу. Не ўвайшлі жаўнеры польскага войска генэрала Андэрса: яны загінулі не ў Беларусі.

Агульная лічба застаецца дакладна невядомай, але, магчыма, яна акажацца меншай за два мільёны ахвяраў, насуперак тым ацэнкам, да якіх мы звыклі.

60-годзьдзе вызваленьня Беларусі ад нацыстаў можа стаць нагодай для сумленнага ўшанаваньня, каб кожнага, хто загінуў, узгадалі пайменна. Менавіта гэта, а не парадная мітусьня, і было б найлепшай аддзякай нашым дзядам.

**Аркадзь Шанскі**

### Ахвяры вайны ў Беларусі

| | | |
|---|---|---|
| Ахвяры сярод насельніцтва | 1 млн 409 тыс. 209 чал. | Ацэнка савецкай камісіі 1945 г. |
| Воіны Чырвонае Арміі, ураджэнцы Беларусі, што загінулі ў 1941—1945 г. | падлікаў няма | |
| Партызаны | 45 тыс.чал. | Ацэнка 1965 г. |
| Ваеннапалонныя, ураджэнцы Беларусі, што загінулі ў лягерах | падлікаў няма | |
| Воіны Чырвонае Арміі, што загінулі на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 г. | 332 тыс. чал. | Зьвесткі Падольскага архіву |
| Ваеннапалонныя, што загінулі на тэрыторыі Беларусі | 810 тыс. 091 чал. | Ацэнка савецкай камісіі 1945 г. |

АД РЭДАКЦЫІ

## Праўда і толькі праўда

Як так можна гаварыць аб блізкіх продкаў: загінула два-тры мільёны? Мільён туды, мільён сюды… Гэта ганьба. Калі так падыходзіць да гісторыі, чалавечае жыцьцё ніколі не пачне ў нашай краіне цаніцца. «Зьніклі людзі? Ну і што…» Гэта ўжо з гісторыі нядаўняй. Не зацікаўленыя ў праўдзе тыя, хто разьлічваюць спэкуляваць на крыві, на ахвярах. Ня думаючы, што комплекс ахвяры стварае для нацыі праблемы сьвядомасьці на будучыню, рыхтуе глебу для нянавісьці, атрутныя плады якой мы назіралі на Балканах.

Імкненьне перабольшыць былыя ахвяры для кагосьці апраўдвае нашы сёньняшнія хібы і адсталасьць. Як жа так, калі выйдзе, што страты Польшчы, кожны пяты жыхар якой загінуў у вайну, былі большымі, чым беларускія. Тады не было б як патрабаваць асаблівага стаўленьня да Беларусі — і руйнуюцца многія нацыятворныя стэрэатыпы савецкае і цяперашняе ўлады.

Гульня ў мільёны мёртвых ператвараецца ў свайго роду нацыянальны спорт. І ўжо ня раз чытаеш пра «мільёны ахвяраў сталінскіх рэпрэсій». Хоць тут якраз архівісты з дакладнасьцю называюць лічбу 600 тыс. рэпрэсаваных, зь якіх прыкладна кожны пяты загінуў. Вусьцішныя лічбы. Не, мала? Даеш больш крыві ў падмурак? Тады чалавек перастае ўспрымаць сьвет рацыянальна, робіцца бездапаможнай ахвярай лёсу.

Дарэчы, не зусім карэктна гаварыць і што ў вайне «загінуў кожны чацьверты» ці «кожны пяты» беларус. Ці не прымяншаем мы тым самым трагедыі габрэяў, цыганоў? Бо ў лічбе 1 млн 400 тыс. найбольш менавіта прадстаўнікоў гэтых пакутных народаў, а ня ўласна беларусаў. Дый сярод ваеннапалонных найбольш гінула не беларусаў — тых якраз распусьцілі па дамах, — а расейцаў дый габрэяў, якіх расстрэльвалі на месцы.

Разумеем, тэма далікатная. «НН» узьняла яе не для таго, каб некага ўзвысіць, а некага прынізіць. Праўда і толькі праўда выхоўвае чалавека маральным. Любыя спэкуляцыі на крыві калісьці адгукаюцца новай крывёю.

# Вяртаньне Быкава



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сотні людзей прыйшлі да магілы Васіля Быкава 19 чэрвеня, у дзень ягонага нараджэньня. І плакала сурма.**

Паказ дакумэнтальнага фільму Віктара Корзуна «Васіль Быкаў. Вяртаньне» адбыўся ў дзень сьмерці пісьменьніка 22 чэрвеня ў Беларускім ПЭН-Пэнтры. У 23-хвілінным стужцы — даўжэзная чарга на разьвітаньне з Быкавым, жалобнае бел-чырвона-белае шэсьце па праспэкце Скарыны. А за кадрам — «Магутны Божа» і голас самога пісьменьніка: Быкаў разважае пра свабоду чалавека і народу, пра нацыянальнае. «Кожны чалавек нараджаецца свабодным», — раз ад разу паўтарае пісьменьнік. І дае жорсткую самахарактарыстыку: «Я пэсыміст, які хоча быць абвергнутым — ці жыцьцём, ці гісторыяй, ці апанэнтам». Інтэрвію было ўзятае яшчэ ў 1997—1998 г., пасьля выхаду кнігі «Сьцяна», грошы на якую сабралі чытачы газэты «Наша Ніва», і перад вымушаным ад'ездам у Фінляндыю. Але ў фільм яно легла настолькі ўдала, што гледачы пасьля паказу пыталіся, ці не апошняе гэта быкаўскае інтэрвію.

«Мы нічога не рабілі адмыслова: сам матэрыял падказваў усё. Нават ідэя фільму нарадзілася спантанна — умоўна кажучы, за мыцьцём посуду. Я нічога спэцыяльна не задумваў. Фільм жыў сам па сабе і падказваў, якія кадры трэба ставіць, а якія — не», — кажа В.Корзун.

Паўмістычны сюрпрыз аўтару фільму пасьля паказу. Ёсьць у стужцы момант, калі камэра павольна наяжджае на маладую пару, якая стаіць перад сцэнай у Доме літаратара, і надоўга затрымліваецца на заплечніку хлопца. Сам «пэрсанаж» фільму якраз апынуўся на праглядзе і патлумачыў, што прывёз у тым заплечніку гарадзенскую зямлю для Быкава — з-пад каталіцкай Вітаўтавай фары і праваслаўнай Каложы...

Прэм'ерны паказ стужкі адбыўся 17 чэрвеня ў Вільні. Фільмам зацікавілася літоўская тэлевізія. А вось у Беларусі ён наўрад ці выйдзе бліжэйшым часам за межы хатніх праглядаў. Прынамсі, супрацоўнікі Музэю беларускай літаратуры сьпярша самі прапанавалі арганізаваць пры канцы чэрвеня вечарыну з праглядам стужкі, а пасьля службовага прагляду — адмовіліся.

У фільме няма ўласна пахаваньня на Ўсходніх могілках — толькі народнае разьвітаньне. Пасьля разьвітаньня заўжды ідзе вяртаньне.

**Аркадзь Шанскі**

ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

# Першы

*Вызваленьню Беларусі прысьвячаецца*



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Зь нейкім няўцямным, але адначасова рашучым настроем ён падняў слухаўку і адрапартаваў па-нямецку: «Станцыя Княгінін на дроце!»

У малым, драўляным, пабудаваным яшчэ бацькам дамку, што стаіць ці ня сто год у мястэчку Княгінін, жыве стары. Усё сваё жыцьцё правеў ён на чыгунцы. А пачалося ўсё даўно, у пачатку цьмяных 40-х .

Пайшоўшы па татавых сьлядах, Шурык (як клікалі яго ў дзяцінстве) скончыў Сувалкаўскую чыгуначную вучэльню і перад другой сусьветнай пачаў працаваць. З прыходам немцаў, як патрэбны спэцыяліст, застаўся пры сваім занятку. Нядрэнна валодаючы мовай новых гаспадароў, 20-гадовы хлопец асвойтаўся з умовамі, прыжыўся сярод гераў, якія на пачатку акупацыі паводзілі сябе даволі прыстойна (дарэчы, як і ўсе акупанты) і не давалі асаблівых падстаў для антыпатыі. Паволі ішоў час: на Ўсход беглі цягнікі, вярталіся, забіралі новых салдат ды зброю і рушылі зноў да Масквы, імкліва праносячыся праз маленькую станцыю, зрэдку спыняючыся з тэхнічных патрэбаў. Стрэлачнік Шурык штодзень рабіў сваю няхітрую справу.

Так неўзабаве прыйшла восень 1942 г. Рухавік Вэрмахту ўжо збаўляў абароты, ды ўсё ж дзякуючы інэрцыі, зададзенай плянам «маланкавай вайны», яшчэ быў здольны на перамогі. Адна зь іх і прыпала на ціхі лістападаўскі дзень. Дзе дакладна праявілася германская мужнасьць і ваенны талент, Шура ня ведаў, дый, зрэшты, вялікай розьніцы не было, бо глыбокі тыл жыў жыцьцём, якое мала мянялася ад такіх падзей. Асабліваcьцю было хіба тое, што пэрсанал чыгуначнай станцыі на чале з камэндантам знаходзіўся ў прыўзьнятым настроі і, не чакаючы канца зьмены, пачаў адзначаць перамогу. І вольныя ад працы, і тыя, хто быў на вахце, з аднолькавым імпэтам ужывалі шнапс. За фюрэра і непераможную Германію было выпіта ня менш кілішкаў, чым у савецкіх бліндажах за Радзіму і Сталіна. Паступова размова перайшла на звыклыя тэмы — аб родных, хатах і даваенных часах, клімат мякчэў і паводзіны разьнявольваліся. Неўзабаве прапанова выпіць паступіла і беларускаму чыгуначніку Шуру, які зусім не прыкладаў высілкаў да трыюмфу зброі гэтага войска. Тым часам у пакоі ўсчаліся сьпевы і пайшоў у справу выцягнуты з кішэні губны гармонік. За вокнамі па-восеньску рана сьцямнела, і задымлены службовы пакойчык зь няяркім сьвятлом зрабіўся зусім малым. Нягледзячы на гэта, у ім сабралася ўся абслуга чыгункі і, ужо не разьбіраючы чыноў, балявала як у апошні раз на забытай Богам станцыі сярод чужых лясоў, падмацоўваючы сваю арыйскую годнасьць мясцовым самагонам, што пайшоў у справу па досыць хуткім скончаньні шнапсу.

Нядзіва, што зумэр тэлефоннага апарата ў пакоі дзяжурнага па станцыі пачуў не ягоны гаспадар, а больш цьвярозы ці мо проста абраны лёсам Шура. Зь нейкім няўцямным, але адначасова рашучым настроем, без папярэдніх разваг ён падняў слухаўку і, рыхтык як гэта рабіў шмат разоў дзяжурны, адрапартаваў па-нямецку: «Станцыя Княгінін на дроце!» На тым баку праз шоргат і тлум манатонна і хутка прамовілі: «Вялейка просіць вольны праход на Полацак». — «Ёсьць праход!» — гэтак жа спраўна і абыякава адказаў выпадковы дзяжурны. Вялейка, нічога не сказаўшы, перарвала размову. Шура павольна паклаў слухаўку і выйшаў з кабінету. Усё было нібы ў сьне. У калідоры па-ранейшаму чуліся гукі п'янай гутаркі, раз-пораз перарываныя няўдалымі запевамі. Ніхто нічога ня чуў. Не пасьпеў хлапец і ачомацца, як ізноў патрабавальна цвянькнуў тэлефон на стале ў пустым кабінэце. Шура аўтаматычна вярнуўся і паўтарыў, як надоечы: «Станцыя Княгінін слухае». — «Будслаў патрабуе праход на Вялейку!» — пачулася здалёк. «Праход дазваляем», — бязьценю сумненьня суха і коратка сказаў дзяжурны.

Пасьля нясьпешна выканаў яшчэ адзін абавязак, што выходзіў за межы яго кампэтэнцыі, — адчыніў уваходныя сэмафоры на адзін шлях з двух бакоў…

Два эшалёны сутыкнуліся позна ўвечары паміж Княгініным і Стражам ля вёскі Ніўкі. Абодва разам з бальшынёй вагонаў зваліліся пад адхон. Непрыдатныя для рамонту цягнікі ляжалі там да канца вайны, і да іх працяглы час хадзілі мясцовыя кавалі па вугаль, што высыпаўся з тэндэраў. Яшчэ даўжэйшы час хадзілі чуткі пра першую буйную і дужа ўдалую акцыю партызанаў у гэтых краёх, якія зьдзейсьнілі такую сур'ёзную дывэрсію. Што ні кажыце, а гэта подзьвіг. Як вядома, дзе ён — там і ўзнагароды. Быў бы герой…

Героі знайшліся. Першая іх частка (нямецкія службачыя станцыі) пасьля хуткага расьсьледаваньня спэцыяльнай камісіі была адпраўлена з маршавымі ротамі на фронт. Наш беларускі герой атрымаў сваю ўзнагароду пазьней (па сканчэньні вайны) у выглядзе 25 год за супрацоўніцтва з ворагамі. Быў высланы ў Караганду, якая была значна далей, чым Усходні фронт, куды трапілі іншыя ўдзельнікі тае падзеі. Хочацца спадзявацца, што ўсё ж Шуру пашчасьціла больш, бо праз пяць год ён вярнуўся дахаты і да пэнсіі працаваў на роднай чыгуначнай станцыі.

Цяпер у свае 84 гады стары рэдка выходзіць з хаты, ня любіць ён распавядаць пра свой учынак, як і пра працу падчас вайны наагул. Ці то, навучаны вопытам, пабойваецца новых «узнагарод», ці, можа, проста ня хоча варушыць даўнейшае. Часам зайздросьціць свайму брату Пятру, які сапраўды супрацоўнічаў зь немцамі, служачы ў БНС, і пасьля падаўся на эміграцыю ў Канаду, далей ад старых і новых гаспадароў. Седзячы ў хаце, дзед слухае чыгунку. Чуе яе нібы круглыя суткі, і яму здаецца, што грукат колаў стаў супадаць з тахканьнем яго ўласнага сэрца.

P.S. Усе падзеі сапраўды мелі месца ў азначаны час. Назвы паселішчаў і імёны ня зьменены. Прозьвішча галоўнага героя па яго просьбе не агучваецца.

**Усевалад Сьцебурака**

# Паварот у кар’еры

**Намесьніка галоўнага рэдактара газэты «Время» грамадзяніна Ўкраіны Міхаіла Падаляка 21 чэрвеня выдалілі зь Беларусі. Рашэньне аб дэпартацыі журналіста яшчэ 16 чэрвеня прынялі старшыня КДБ Леанід Ерын і генпракурор Віктар Шэйман. Падставай абвешчана неназваная публікацыя ў газэце, што заклікала «да дэстабілізацыі палітычнай сытуацыі». Падаляку, жанатаму зь беларускай грамадзянкай, забаранілі ўезд на тэрыторыю краіны на 5 гадоў. Зранку 21-га супрацоўнікі сілавых структураў прыйшлі да Падаляка дадому, далі 15 хвілінаў на зборы і павялі на цягнік «Менск—Адэса». Усё было зроблена для таго, каб выдварэньне прайшло гучна. Вагон, у якім яго вывозілі, быў пад аховай міліцыянтаў і супрацоўнікаў спэцслужбаў у цывільным, але незалежных журналістаў, як і здымачную групу БТ, спэцслужбісты ў цывільным да Падаляка падпускалі. Праз скандальныя матэрыялы аўтарства Падаляка была ў свой час зачыненая «Наша свабода». Паводле інфармацыі «НН», журналіст не ўнікаў актыўных кантактаў з прадстаўнікамі спэцслужбаў. Ці азначае гэта, што ён стаў выяўляць празьмерную самастойнасьць? У любым разе, гэтаму выпускніку мэдінстытуту прыйдзецца цяпер працаваць па-за межамі Беларусі.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**На здымку: дэпартаваны журналіст Міхаіл Падаляк, супрацоўнік беларускіх спэцслужбаў і ўсюдыісная журналістка БТ.**

# Адкрыты фрэскі XVIII стагодзьдзя

## Сэнсацыя ў Воршы

На завяршальным этапе рэканструкцыі жылога будынку трынітарскага кляштару ў Воршы адбылася сапраўдная сэнсацыя. У адным з пакояў на першым паверсе, змываючы старую тынкоўку, рабочыя заўважылі на сьцяне выразны відарыс мужчынскага твару. Як аказалася, фрагмэнтамі партрэтаў ды арнамэнтам пакрыты амаль усе сьцены і столь пакою.



**Выява невядомага сьвятога. Гэты фрагмэнт фрэсак у кляштары трынітараў захаваўся найлепш.**

Двухпавярховы мураваны будынак быў узьведзены разам з касьцёлам Сьвятой Тройцы ў 1714 г. фундушам Уладзіслава і Адама Саковічаў. Пасьля закрыцьця кляштару ў 1832 г. касьцёл быў перабудаваны ў праваслаўны Ўваскрасенскі сабор, а ў жылым будынку адчынілася гарадзкое вучылішча. За савецкім часам сабор перабсталявалі ў аэраклюб, а ў будынку разьмясьцілася палкавая школа. Пасьля вайны сабор зь вялікімі намаганьнямі зьнесьлі, а будынак унесьлі ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў, выкарыстоўвалі пад жыльлё, склады ды занальны архіў.

Адкрытыя старадаўнія фрэскі агледзеў намесьнік начальніка ўпраўленьня па ахове спадчыны Ігар Чарняўскі. «Такіх значных адкрыцьцяў у Беларусі яшчэ не было. Гэта мае вялікае значэньне для ўсёй краіны. Цяпер паўстаюць два пытаньні: з аднаго боку, адкрыцьцё не павінна спыніць рэканструкцыю будынку, з другога боку — як захаваць гэтыя каштоўныя элементы?» Дарэчы, апошнім адкрыцьцём у Беларусі былі фрагмэнты фрэсак XII ст. — у Каложы ў Горадні. А вось такой знаходкі, як у Воршы, навукоўцы ня памятаюць.

У найбліжэйшы час спэцыялісты дадуць рэкамэндацыі, якім чынам працягваць работы, як закансэрваваць выяўленыя фрэскі з тым, каб потым паэтапна правесьці іх рэстаўрацыю.

Як запэўніў загадчык аддзелу архіваў Віцебскага аблвыканкаму Міхаіл Пішчулёнак, у памяшканьні будзе ўстаноўлена абсталяваньне, якое не перашкодзіць усім цікаўным пабачыць фрэскавы росьпіс.

Апошнім часам Воршы шанцуе на сэнсацыі. Летась падчас раскопак былі знойдзены магутныя падмуркі на Аршанскім замчышчы. Ня меншых сэнсацыяў трэ будзе чакаць, калі пачнецца доўгачаканая рэстаўрацыя іншых помнікаў аршанскае даўніны — Куцеінскага манастыра, езуіцкай калегіі, базыльянскага кляштару.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

### Абмывалі новы трактар — і адрэзалі вуха

Прыжываецца дурны звычай — «абмываць» самагонам усё, што зьяўляецца новага на падворку селяніна і нават на калгасным мэхдвары. Групуюцца кампаніі, норма выпіўкі на чалавека — ня менш за паўлітэрку, а то і больш, у залежнасьці ад каштоўнасьці абновы. Так здарылася нядаўна ў адным з аддаленых калгасаў на Случчыне. Набылі там новы трактар, старшыня перадаў яго найлепшаму, на ягоную думку, трактарысту. А таго адразу ўзялі ў атачэньне сябры па прафэсіі: давай, браце, абмыем тваю абнову. У недалёкім ляску прыселі вакол батарэі бутэлек з моцным напоем, двое з кампаніі перапілі сьпіртнога і ўсчалі бойку. Адзін другому паласнуў нажом (ці вострым абломкам шкла) па вуху — і тое завісла на аскабалку скуры. Старшыня запіхнуў небараку ў машыну — і хутчэй у раённую бальніцу, дзе пацярпеламу ў траўматалягічным аддзяленьні прышылі тое вуха, а праз тыдзень выпісалі далечваца дома. Да міліцыі справа не дайшла: замялі самі выпівохі.

Дапілася вёска, як кажуць, да пакатунку, аб чым сьведчаць зьвесткі, пачутыя ад супрацоўнікаў той траўматалёгіі. Амаль 70% паступаючых да іх пацыентаў — пацярпелыя або саўдзельнікі сямейных разборак, вулічных ці дваровых боек, калектыўных п’янак з усялякай нагоды. З нажавымі, колатымі, рэзанымі раненьнямі ў ногі, рукі, твар, грудзі. Асабліва шматлікі «завоз» у дні афіцыйных і прафэсійных сьвятаў. Нялішне будзе напомніць, што ў аб’ёме выручкі ад продажу прадуктаў харчаваньня за год сьпіртныя напоі займаюць зьвыш як 35%, а гэта ў пераліку на душу насельніцтва — зьвыш як 8 літраў чыстага сьпірту! Ці ня дойдзем мы ўрэшце да перадпатопавага маразму і выраджэньня, калі Бог пакіне на Зямлі новага Ноя з выратавальным каўчэгам?

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

### Сэрвіс па-расейску

У новым навучальным годзе ў Воршы адкрыецца філія Маскоўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту сэрвісу. Гэта будзе першая яго філія ў Беларусі. Дарэчы, першыя 35 студэнтаў ужо вучацца на завочным аддзяленьні будучае філіі па спэцыяльнасьці «Машынабудаваньне». Навучаньне платнае, яго вядуць выкладчыкі Смаленскае філіі МДУС. Плянуецца таксама рыхтаваць спэцыялістаў у фінансах і турызьме. Мясцовыя ўлады ня раз зьвярталіся ў Міністэрства адукацыі з просьбай адкрыць у Воршы філію айчыннай тэхнічнай ВНУ, бо тут шмат прадпрыемстваў, дзе востра адчуваецца дэфіцыт спэцыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Але ўсё дарэмна. Ворша па-ранейшаму застаецца адзіным буйным горадам у Беларусі, дзе няма ніводнай ВНУ.

### Знайшлі вінаватых

Некалькі месяцаў супрацоўнікі аддзелу па барацьбе з эканамічнай злачыннасьцю Аршанскага РУУС правяраюць працу сельскіх бібліятэк на прадмет прыпісак чытачоў ды выдачы літаратуры. А ў сувязі з тым, што ў вёсках чытаюць усё меней (бо значную частку жыхароў складаюць пэнсіянэры ды п’янтосы), бібліятэкам трэба мець чытачоў ды кнігаабмен хоць на паперы. Таму і ідуць на прыпіскі. Пяць бібліятэкарак аштрафаваныя на 70—80 тысяч рублёў. Улічваючы, што бібліятэкары на вёсцы — адны з самых высокааплатных работнікаў (атрымліваюць па 120—170 тысяч), памеры штрафаў, можа, і не такія вялікія. Толькі загадчыца Пішчалаўскай бібліятэкі аштрафаваная судом на 520 тысяч рублёў. «Паляваньне» на несумленных бібліятэкараў працягваецца.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Таямніцы Запалоцьця

Два першыя тыдні чэрвеня на беразе Дзьвіны ў ваколіцах полацкага старажытнага пасаду Запалоцьце праходзілі археалягічныя раскопкі пад кіраўніцтвам выкладчыка ПДУ Дзяніса Дука. Дапамагалі археолягу весьці дасьледаваньне вучні полацкіх школ. Падчас раскопак быў адкрыты культурны пласт XI—XII ст. таўшчынёй 1,5 мэтра. Дз.Дук сьцьвярджае, што гарадзкі раён Запалоцьце ў XI—XII ст. быў больш шым за сёньняшні. Але чамусьці пасьля XII ст. на гэтым месцы людзі часова сяліцца спынілі. Памеры раскопу — 40 кв.м, сярод знаходак — лязо баявой сякеры, бронзавы пярсьцёнак, побытавыя рэчы, рэшткі пабудовы. У ліпені раскопкі ў Запалоцьці — найменш дасьледаваным полацкім пасадзе — прадоўжацца.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Быкаўскія чытаньні на філфаку

Пад дзень нараджэньня Васіля Быкава на філфаку БДУ адбыліся чытаньні памяці пісьменьніка. Першым выступіў новы рэктар Васіль Стражаў, які паведаміў пра наданьне імя юбіляра 402-й аудыторыі, дзе сабраліся прысутныя. Затым рэктар распавёў аб сваім захапленьні быкаўскай прозай, якая прывучыла яго да беларускага слова. Афіцыйную частку працягнуў намесьнік міністра культуры сп.Гедройць. Пералік усіх званьняў пісьменьніка плаўна перайшоў у сьпіс мерапрыемстваў сёньняшняй улады на карысьць культуры.

Ідылію парушыў госьць з Масквы Валянцін Аскоцкі, які з абурэньнем загаварыў пра нядаўнюю забарону фільму пра пісьменьніка. Самым цікавым было паведамленьне В.Аскоцкага, што В.Быкаў, аказваецца, сапраўды пісаў вершы, і ня толькі ў юнацкіх гадах. Былі працытаваны радкі, якія пісьменьнік прысьвяціў забойцам, што ставяць подпіс пад нэкралёгам ахвяры. Іх ня шкодзіла б прачытаць аднаму вядомаму «аматару» быкаўскай паэзіі.

Вершы, прысьвечаныя самому юбіляру, чытала Рыма Казакова. Выступалі таксама госьці з Украіны, у тым ліку пасол, дэкан філфаку БДУ І.Роўда, выкладчыкі факультэту. Прафэсар Л.Сінькова (яна ж старшыня аргкамітэту чытаньняў) гаварыла аб успрыманьні быкаўскіх твораў за мяжой. На яе думку, творчасьці В.Быкава зусім не ўласьціва эпічнасьць, стэрэатып аб ёй узьнік праз неразуменьне беларускага мэталітэту пісьменьніка, такіх ягоных рысаў, як нелюбоў да рыторыкі, стрыманасьць.

Чытаньні зрабілі вялікае ўражаньне на студэнтаў і асьпірантаў факультэту.

**Усяслаў Шатэрнік**

# Канстытуцыя Эўропы:

## 4:1 на карысьць Францыі

**Апанэнты Канстытуцыі спадзяюцца адыграцца падчас ратыфікацыі дакумэнту.**

У той час як на футбольным першынстве Эўропы толькі паспелі вызначыцца чвэрцьфіналісты, фаварыт на канстытуцыйным полі Эўразьвязу ўжо вядомы. Францыі ўдалося вырашыць шмат якія спрэчныя моманты ў праекце эўрапейскай Канстытуцыі на сваю карысьць і гэтым самым замацаваць свой уплыў у структурах Эўразьвязу.

Пры ўсёй павазе да дэмакратычных ідэалаў Эўропы і насуперак патаснасьці прамоваў эўрапалітыкаў пра «гістарычнасьць моманту», назваць Канстытуцыю Эўразьвязу шэдэўрам юрыдычнае думкі ніяк не выпадае. Аб'ём зацьверджанага на мінулым тыдні дакумэнту, адной з першапачатковых мэтаў якога было спрашчэньне існых правілаў, пасьля двухбаковых дэбатаў стаў 300 старонак. Залішне і казаць, што простыя грамадзяне Эўропы наўрад ці адважацца ўзяцца за вывучэньне новага падставовага закону Эўропы: насуперак мэтам аўтараў праекту, Эўропа стаецца яшчэ больш складанай і яшчэ больш далёкай ад эўрапейцаў. З тае прычыны вобраз афіцыйнага Брусэлю як бюракратычнага монстра набудзе новае падмацаваньне і эўраскептыкі атрымаюць новыя козыры ў іхнай палітычнай барацьбе. Акрамя таго, некаторыя палажэньні дакумэнту ўжо цяпер падаюцца голымі дэкляцыямі. Прыкладам, канстытуцыя абвяшчае роўнасьць усіх грамадзян Зьвязу, у той час як толькі тры краіны (Вялікабрытанія, Швэцыя і Ірляндыя) адкрылі свае рынкі працы для ўсходнеэўрапейцаў.

Зважаючы на недакладнасьць дакумэнту, варта перадусім засярodзіцца на спрэчных момантах і на тым, пазыцыя якой краіны ўрэшце перамагла. І тут найлепей прыдасца мова футбольных камэнтатараў, балазе што ўся Эўропа цяпер жыве футболам. Пералічым усе «галы», забітыя на канстытуцыйным полі.

— Паводле канстытуцыі, Эўразьвяз набывае дзьве новыя пасады: прэзыдэнта і міністра замежных спраў. Можна прадбачыць, што гэтыя чыноўнікі будуць прэзэнтаваць пазыцыю, блізкую да афіцыйнага Парыжу, улічваючы вялікі досьвед і вагу францускае дыпляматыі. Францыя павяла ў ліку 1:0.

— Па-новаму вызначаная працэдурная большасьць для прыняцьця рашэньняў у Эўракамісіі і Радзе міністраў. Цяпер тут дзейнічае прынцып «двайное большасьці»: кожнае рашэньне патрабуе падтрымкі 55% краінаў Зьвязу і 65% насельніцтва Зьвязу. Агулам прынцып «двайной большасьці» павялічвае вагу вялікіх краінаў — Нямеччыны і Францыі. 2:0 на карысьць Францыі. Праўда, у сфэрах замежнай палітыкі, сацыяльнай бясьпекі і абароны застаецца старое права veto для кожнай асобнай краіны, на чым настойвалі Вялікабрытанія і Польшча, — 2:1.



Тоні Блэр відавочна мае што адказаць Жаку Шыраку. AP

— Насуперак прапановам Ватыкану прэамбула канстытуцыі не ўтрымлівае спасылкі на Бога і хрысьціянства як вядучы элемэнт у жыцьці Эўропы. Сярод краінаў Зьвязу найбольшай прыхільніцай такой спасылкі была Польшча, якая ў сваёй уласнай канстытуцыі ўзгадвае хрысьціянства. Але ўрэшце перамог швэдзкі падыход, падтрыманы Францыяй, дзе падзел дзяржавы і царквы ёсьць адным з падставовых прынцыпаў рэспублікі з часоў Вялікае Французскае Рэвалюцыі. 3:1.

— Прапанова Нідэрляндаў пра абавязковае выкананьне трохпрацэнтовага ліміту на дэфіцыт дзяржаўных бюджэтаў (так званы «Пакт стабільнасьці і эканамічнага росту») заблякаваная. Трохпрацэнтовая плянка ўзгадваецца ў канстытуцыі, але ж выразныя рычагі кантролю за бюджэтамі адсутнічаюць. Францыя і Нямеччына могуць і надалей рабіць даўгі ў неабмежаванай колькасьці, пры гэтым не баючыся наступстваў. Францыя вядзе 4:1.

Нарэшце, фінальная перамога французкіх дыпляматаў — сам факт прыняцьця канстытуцыі. Па вялікім рахунку, гэткія палітычныя спэктаклі патрэбныя ў першую чаргу кіраўнікам, якія ня надта ўпэўнена пачуваюцца на ўласным унутрыпалітычным полі. Не сакрэт, што Францыя разам зь Нямеччынай уяўляюць сабой самыя праблемныя выпадкі ў эканоміцы Эўразьвязу. Агульнавядомая таксама няздольнасьць французкай палітычнае эліты да рэфармаваньня неадпаведнай часу сацыяльнай сыстэмы краіны. Палітычны застой самым непасрэдным чынам уплывае на эканамічную вагу краіны: калі ў 70-х гадах мінулага стагодзьдзя французская эканоміка важыла на 25% больш за брытанскую, на сёньня французская гаспадарка ўжо меншая за брытанскую на 9%. Вось жа, імітацыя бурлівай дзейнасьці на эўрапейскім узроўні адцягвае ўвагу францускіх выбарцаў ад сур'ёзных праблемаў унутры краіны.

Такім чынам, як па ліку, так і па гульні перамога Францыі на канстытуцыйным полі Эўропы выглядае пераканаўчай. Але ці будзе яна канчатковай? Паводле працэдуры, канстытуцыя яшчэ мае быць зацьверджаная ўсімі сябрамі Зьвязу. Пры гэтым ратыфікацыя можа быць праведзеная альбо праз парлямэнты, альбо праз рэфэрэндумы, як гэта плянуецца ў Вялікабрытаніі і некаторых краінах Усходняй Эўропы. Вось жа, вынікі гэтых рэфэрэндумаў для прыхільнікаў глыбейшай інтэграцыі могуць быць вельмі расчаравальнымі, зважаючы на нізкую актыўнасьць выбарцаў і рост папулярнасьці эўраскептыкаў на апошніх выбарах у Эўрапарлямэнт. Такім чынам, апанэнты французскага ўплыву ў Зьвязе могуць узяць рэванш, а сам Эўразьвяз рызыкуе апынуцца ў самай сур'ёзнай палітычнай крызе за ўсе часы свайго існаваньня.

**Сяржук Вінаградаў**

# Што будзе з Іракам пасьля 30 чэрвеня

**Працяг са старонкі 2.**

Добрае тлумачэньне таго, што робіцца ў Багдадзе сёньня, калі амэрыканцы спрабуюць прымусіць ірацкаў дамовіцца і навучыцца *дзяліць* уладу.

Аднак амэрыканцы ў сьвядомасьці ірацкаў выступаюць як асноўныя гаспадары сытуацыі, а таму палітыка канцэнтруецца вакол дачыненьняў з амэрыканцамі, а не зь іншапляменнымі суайчыньнікамі.

Амэрыканскія жаўнеры ня гінуць толькі на тэрыторыі, кантраляванай курдамі. Курдыстан — адзіная частка Іраку, дзе існуюць амаль нармальныя дзяржаўныя структуры. Але ці можна назваць іх ірацкімі? І ці можна інтэграваць іх у адзіны Ірак? Усе мае знаёмыя ірацкія курды рашуча кажуць — не.

Інтэграцыя вымагае двухбаковых дзеяньняў і саступак. Пакуль жа падзеі ў Багдадзе сьведчаць пра іншае — амэрыканцы пераходзяць да выкарыстаньня традыцыйных схемаў. Курдзкія і шыіцкія арганізацыі застаюцца на ўскрайку канвэнцыйнай палітыкі. Курды спадзяваліся стаць сугаспадарамі заможнай краіны, але не атрымалі амаль нічога. Гэта падштурхоўвае іх капаць акопы: калі немагчыма здабыць Ірак, трэба хаця б адстаяць Курдыстан. Курдзкія партыі збліжаюцца і апошнім часам дасягнулі пэўных посьпехаў на абшары агульнакурдзкай палітыкі, напрыклад, да іх шэрагаў далучыліся многія байцы радыкальных арганізацый турэцкіх курдаў. На Ірацкі Курдыстан глядзяць з надзеяй курды ва ўсім сьвеце. Гэтай вясной, шукаючы старых сяброў у Іранскім Курдыстане, ня раз даводзілася сустракаць у адказ на роспыты лагодную ўсьмешку іх сваякоў ды з гонарам прамоўленае: «Ён сышоў у вольны Курдыстан!..»

Іншым гульцом ірацкае палітыкі выступае шыіцкі рух, які бясконца дэманізуецца ў СМІ. Яго зьвязваюць з Іранам, але варта было б адмовіцца ад гэткага зручнага тлумачэньня ўсіх злыбедаў. Бо ў пляне ўзьнікненьня шыіцкае галіны ісламу ўсё акурат наадварот — менавіта з Іраку ідуць яе вытокі. Тут гістарычныя асяродкі духовага праваднірства для шыітаў. А таму якую пагрозу можа ўяўляць сабой шыіцкі рух для шыіцкай па сутнасьці краіны? Але калі глядзець з пункту гледжаньня традыцыйных раскладак ва ўладных структурах краіны — тады, вядома, усё наадварот.

Бясспрэчна, найляпчэй не выдумляць новага, а ўзяць добра забытае старое. Рызыкоўна перараблясць Ірак карэнным чынам: зьменіцца расклад сілаў, зрушыцца баланс у рэгіёне. А таму ЗША ўсё больш спакушаюцца варыянтам рэстаўрацыі мяккага аўтарытарызму. Ну што вучыць іх дэмакратыі, разважаў генэрал Санчэс, яны ж лепш разумеюць катаваньні. Разважаючы пра аднаўленьне раўнавагі ў Іраку, Уолтэр Лак'ер з вашынгтонскага Цэнтру стратэгічных і міжнародных дасьледаваньняў наўпрост піша: «Ірацкам дапаможа толькі шокавая тэрапія. Дэмакратызацыя ж заўжды была толькі хімэрай».

Адзін з самых уплывовых спэцыялістаў ЗША па Блізкім Усходзе Дэніэл Пайпс трыюмфаваў пасьля таго, як Вашынгтон вырашыў адмовіцца ад шырокай дэбаасізацыі краіны і зноў пачаў працаўладкоўваць чальцоў партыі. Маўляў, нарэшце амэрыканскі ўрад пачаў праводзіць рэальную палітыку й вызваліўся ад ідэалістычных канструкцыяў Шалабі (які змагаўся супраць ідэі выкарыстаць старых партайгеносэ ў мэтах адбудовы дэмакратычнага Іраку), радаваўся Пайпс ды тлумачыў, што найпрасьцейшае выйсьце — падправіць старую структуру ды хай сабе стаіць, адно каб новы ўрад не займаўся авантурамі накшталт кувэйцкай ды трымаўся пэўных рамак (а не дэманстратыўна грэбаваў маральнымі прынцыпамі, як Хусэйн).

> ЗША ўсё больш спакушаюцца варыянтам рэстаўрацыі ў Іраку мяккага аўтарытарызму.

Што азначала апошняя падзея — рашэньне дазволіць вярнуцца на свае пасады «старым байцам» — для курдаў і шыітаў, цяжка перадаць словамі. Ледзь вызваліўшыся, яны зноў апынаюцца пад уладай тых, хто апошнія гадоў дваццаць няспынна мардаваў іх, рабаваў і зьдзекаваўся зь іх! Чальцы партыі «Баас» зьяўляюцца не абстрактным злом, як, напрыклад, сябры КПСС у 1991 г., а вельмі нават пэўным увасабленьнем крывіцаў гора для курдаў і шыітаў сёньня, скажам, як удзельнікі фашысцкіх партый для жыдоў у 1945 г. Лік забітых за апошнія два дзесяцігодзьдзі шыітаў і курдаў ідзе на многія сотні тысяч. Ледзь ня кожная сям'я была закранутая. І цяпер, калі амэрыканцы вяртаюць да ўлады гэтых людзей, якога зьмяншэньня гвалту можна чакаць?

Напярэдадні 30 чэрвеня падстаў для аптымізму адносна лёсу Іраку бракуе. Бачацца два магчымыя шляхі разьвіцьця сытуацыі. Папершае, рост бязладзьдзя і ўзьнікненьне сытуацыі, падобнай да аўганскай, далейшая фрагмэнтацыя краіны і, магчыма, распад. Вы скажаце, нафта гэтага не дазволіць? Але нафтавыя кампаніі могуць працаваць на поўначы й поўдні, не зважаючы на рэшту краіны. Дарэчы, гэты варыянт — шанец для курдаў атрымаць сваю дзяржаву.



Новы прэзыдэнт Іраку Газі аль-Яур. AP

Другім і нават найбольш імаверным варыянтам разьвіцьця падзей здаецца вяртаньне да крыху падпраўленай і пазбаўленай самых злавесных адзнак традыцыйнай сыстэмы ўлады. Г.зн. без «Баас» і Садама, але са стабільнасьцю, што трымаецца на рэпрэсіях і ўціску. Досьвед гэтага ў Вашынгтоне ёсьць, нават у дачыненьні да Іраку — у часы, што папярэднічалі 1990 г.

**Сяргей Прытыцкі**

# Дзяўчыначка 40-га памеру

## Дэпутатка Віцебскага гарсавету і былая лідэрка «Зубра» Вольга Карач паставіла горад на вушы, спазнала сыстэму ўлады і цяпер ня ведае, што рабіць

Працяг са старонкі 2.

**«НН»: Вольга, як здарылася, што кіраўніца віцебскага «Зубра» стала дэпутаткай гарсавету?**

**В.К.:** Перамога нам была патрэбна, каб паверыць у свае сілы. Трапіць у гарсавет было цяжка, амаль немагчыма. Маімі канкурэнтамі былі галоўны доктар палiклінікі і кіраўнік жыльлёва-камунальнай службы, дзядзькі гадоў па 50 — у два разы старэйшыя за мяне. Але мы па тры разы абышлі ўсе кватэры. Гарвыканкам мяне сустракаў, чакаючы ўбачыць нейкага монстра. А калі я прыйшла ў касьцюме і прыстойна выглядала — было адчуваньне нэрвовасьці, яно захоўваецца і цяпер.

**«НН»: Як ты адчула сябе ў гэтай новай ролі дэпутаткі з афіцыйным статусам пасьля доўгага апазыцыйнага змаганьня?**

**В.К.:** Пасьля перамогі ў мяне была зацяжная трохмесячная дэпрэсія. Я ня ведала, што рабіць. Аказалася, што мы зусім не гатовыя да перамогі. Нават не разглядаўся варыянт пасьля перамогі… Пасьля выбараў былы старшыня гарсавету Ўладзімер Пелагейка мяне спыніў і кажа: «Слухай, Вольга, ты «зубр», ты тут ставіла горад на вушы, за табой ганялася міліцыя, хто толькі ні ганяўся. Вось вы змагаецеся з Лукашэнкам, а ці ёсьць у вас нейкая праграма выйсьця з крызысу? Давай яе прымем на ўзроўні гораду і рэалізуем». Але ў нас такой праграмы на той момант не было. Каб паверылі чыноўнікі, трэба пакрокавая праграма па асноўных пытаньнях, такіх, як праблемы ЖКГ, напрыклад капрамонт «хрушчовак». Я беспартыйная і ніколі не была ў партыях, але я ўступіла б сёньня ў любую партыю, якая б мне паказала канкрэтную пакрокавую праграму.

**«НН»: Чаму цябе навучыў гарсавет?**

**В.К.:** У гарсавеце ў мяне зьмяніліся меркаваньні пра нейкія пытаньні. На многія рэчы глядзіш паіншаму, калі бачыш знутры, як функцыянуе гэтая сыстэма. Бачыш, як шмат праблем, якія трэба вырашаць, але пры пустым бюджэце цяжка нечага дасягнуць. Усё, што можа гарсавет, — гэта выціскаць нейкія сродкі з прадпрымальнікаў, але бюджэт пусты, а прадпрымальнікам і так цяжка жывецца, яны ў такой прававой сыстэме ня могуць працаваць, так што зь іх таксама не навыціскаеш. Выходзіць замкнёнае кола. Жыхары ня могуць уплываць ні на што, ня ведаюць, куды ідуць іх грошы за камунальныя паслугі. Адсюль і пасіўнасьць. Ды што казаць, калі са скаргамі наконт кантрактнай сыстэмы да нас зьвярнуліся толькі тры чалавекі з усяго гораду! Гэта пры тым, што працоўнае заканадаўства вельмі добрае і элемэнтарна можна аднавіць на працы чалавека, які быў звольнены. Але людзі баяцца зьвязвацца з уладай, пануе думка «я як-небудзь адсяджуся ўбаку».

**«НН»: Як табе ўдаецца працаваць у гарсавеце адной супраць афіцыйных дэпутатаў?**

**В.К.:** Галоўная праблема — ня тое, што я адна, а тое, што ў мяне няма гатовых рэцэптаў. Я казала нашым прадпрымальнікам: у вас ёсьць праграма дзеяньняў? Вось я ў гарсавеце, гатова прасоўваць вашы патрабаваньні. Але яны ня маюць такой праграмы. А пасьля ім прыходзіцца галадаць.

А ў гарсавеце сядзяць таксама людзі, якія ўсё разумеюць, нармальныя людзі, якія выраслі ў гэтай краіне і хочуць зрабіць нешта добрае. Мы розныя ў стылі мысьленьня, бо ў іх толькі адна крыніца інфармацыі і гэта ўплывае на сьветапогляд. Яны не вучыліся грамадзянскай адукацыі так, як апазыцыя. Але яны таксама нездаволены сытуацыяй, ня бачаць выйсьця, але ня маюць ніякага даверу да апазыцыі, ня вераць, што яна можа кампэтэнтна вывесьці краіну з крызысу. І таму дэпутаты ніколі не палезуць у авантуры, якія часам апазыцыя прапануе. Адзін з дэпутатаў аднойчы сказаў мне: «Шанцуе табе, Вольга, ты — незалежны дэпутат». І многія дэпутаты сапраўды рызыкуюць сваёй пасадай: калі гэта дырэктар заводу, яго нават можна пасадзіць. Гэта мяне паніжаць ужо няма куды, бо настаўнік у школе — гэта самае нізкае сацыяльнае становішча, якое толькі можа быць у нашым грамадзтве.

**«НН»: Ці лічацца з тваім меркаваньнем?**

**В.К.:** Ну, са мной цяжка не лічыцца. Натуральна, спачатку да мяне ня ставіцца сур'ёзна: дзяўчыначка нейкая 40-га памеру, я не магу простай масай прымусіць да мяне прыслухоўвацца, але пасьля таго як некалькі разоў выступіла, мяне пачалі паважаць.

**«НН»: А як складваюцца твае адносіны з выбарцамі?**

**В.К.:** Яны нават ня ведаюць, чым адрозьніваецца дэпутат гарсавету ад дэпутата парлямэнту. У анкетах на пытаньне «Што вы хочаце ад дэпутата?» мне часта пішуць: «Расстраляць таго, гэтага…» Вельмі любяць страляць нашы людзі. Галоўная праблема Беларусі — гэта Савецкі Саюз у галовах. Людзі ня ведаюць сваіх правоў і не змагаюцца за іх, ім прасьцей думаць пра Курыльскія выспы, на якія прэтэндуе Японія. Таму й няма грамадзкага кантролю і адбываецца тое, што адбываецца. Гэта мы далі права Лукашэнку стаць такім, якім ён стаў. Калі б усе людзі выйшлі на вуліцы пасьля таго, як выйшлі газэты зь белымі плямамі, ён бы не дазволіў сабе наступных крокаў. Альбо ў 1999-м годзе, альбо ў 2001-м… Не выходзяць. Так любы чалавек робіцца нахабным, калі не адчувае супраціву. На рэпрэсіі трэба адказваць. Пісаць лісты ў пракуратуру, засыпаць іх лістамі. У гэтай сыстэме калі ты змагаешся за канца — ты перамагаеш. Гэта толькі пытаньне часу.

**«НН»: Як ты сумяшчаеш палітыку з асабістым жыцьцём?**

**В.К.:** Я замужам ужо 5 год. Муж журналіст, займаецца грамадзкай дзейнасьцю. Часам бывае цяжка і яму, і мне. Але мой муж вельмі актыўны ды разумны, і я шчасьлівая, мне зь ім вельмі пашанцавала. Натуральна, цяжка, бо праца дэпутата мясцовага Савету ніяк не аплачваецца і няма ніякіх ільготаў, а дэпутацтва забірае шмат часу. Іншыя дэпутаты робяць прыём выбарцаў раз на месяц, я — раз на тыдзень у панядзелкі. Для мяне гэта вельмі цяжкі дзень. Людзі ідуць і ідуць, усе зь нейкім горам, многія плачуць, просяць дапамагчы. На гэтых прыёмах адчуваю проста такое ўсенароднае гора. Тут галоўнае — вытрымаць гэта псыхічна. А яшчэ ж моладзі таксама трэба прысьвячаць час.

**«НН»: Што ты думаеш пра парлямэнцкія выбары?**

**В.К.:** Гэтая восень у мяне асацыюецца зь нечым чорным. Проста ня ведаю, што будзе адбывацца. У мяне такое адчуваньне, што нас чакае каляпс. Што да выбараў, я ня бачу мэтазгоднасьці свайго, напрыклад, вылучэньня. Паводле маіх падлікаў, калі акруга складае 7 тысяч, трэба мець 70 актывістаў. А калі парлямэнцкая акруга налічвае 70 тысячаў выбарцаў, адпаведна і валанцёраў патрэбна 700. Сёньня такога актыву ня мае ніводная арганізацыя. А апазыцыі патрэбны перамогі, пасьпяховыя прыклады. Людзі стамляюцца, калі ўсё дрэнна.

Акрамя таго, мяне вельмі хвалюе пытаньне рэфэрэндуму. Калі разам з выбарамі спалучаць рэфэрэндум, што тады? Хто будзе ім займацца? Я па сваіх выбарцах бачу, што як мінімум 50% прагаласуюць супраць трэцяга тэрміну, а гэта значыць, што патрэбна моцная сыстэма назіральнікаў, каб адстаяць гэты вынік. А хто будзе выстаўляць назіральнікаў, калі ўсе займаюцца выбарамі? Нельга праводзіць дзьве кампаніі адразу.

**«НН»: Ці гатовае беларускае грамадзтва да прэзыдэнта-жанчыны?**

**В.К.:** Я думаю, што жанчына — гэта быў бы ідэальны варыянт. Але я ня бачу, хто б з жанчын мог бы ўзяць на сябе ролю нацыянальнага лідэра. Жанчыны ў нас у палітыцы не выжываюць.

Гэта як з моладзьдзю, за якой грамадзтва не прызнае права лідэрства. А час зьмяніўся. Раней бацькі перадавалі досьвед дзецям, цяпер дзеці дапамагаюць бацькам адаптавацца. Зьмянілася, стала невідочнаю сьмерць, сьвет стаў глябальным, зьявіўся Інтэрнэт, сувязь стала больш даступнай. Калі гэтых зьменаў не асэнсуе наша пакаленьне, мы папросту спознімся. Гэта як зь Сянном: у Сяньне ўпершыню зьявілася электрычнасьць у 60-х гадах, калі чалавек ужо паляцеў у космас.

**Гутарыла Вераніка Дзядок**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У анкетах на пытаньне «Што вы хочаце ад дэпутата?» мне часта пішуць «Расстраляць таго, гэтага»... Вельмі любяць страляць нашыя людзі. Галоўная праблема Беларусі — гэта Савецкі Саюз у галовах. Людзі ня ведаюць сваіх правоў і не змагаюцца за іх, ім прасьцей думаць пра Курыльскія выспы, на якія прэтэндуе Японія.

### ДАВЕДКА «НН»

Вольга Карач нарадзілася ў Віцебску ў 1979 г. ў працоўнай сям'і, чым вельмі ганарыцца. Скончыла с залатым мэдалём школу і з чырвоным дыплёмам — філфак Віцебскага ўнівэрсытэту. У ВНУ стварыла літаратурны гурток «Сёмая грань», які пасьля разросься да ячэйкі «Зубра», а цяпер у поўным складзе зьяўляецца групай падтрымкі дэпутаткі Вольгі Карач. Працуе выкладчыцай ангельскай мовы ў школе. Ня п'е нічога мацнейшага за беларускае піва, ня паліць. У юнацтве марыла стаць пісьменьніцай, піша апавяданьні і вершы, марыць напісаць жартоўны дэтэктыў пра апазыцыйнае змаганьне і «пра ўсе тыя сьмешныя і часам трагічныя сытуацыі, якія здараліся ў нашым змаганьні».




**Зь Фядорай Конюхавай працавалі Акадэмія навук СССР, Інстытут радыётэхнікі і радыёэлектронікі, Усесаюзны навукова-дасьледчы і выпрабавальны інстытут мэдыцынскай тэхнікі Міністэрства аховы здароўя СССР, катэдра шпітальнай хіругрії Ўнівэрсытэту дружбы народаў. Усе паўтаралі адну ідэю: фэнамэнальныя здольнасьці, надзвычай моцнае біяполе, гаючыя здольнасьці навукай пацьвярджаюцца, але не тлумачацца.**

# Фядора

Аляксей Бацюкоў

Я быў упэўнены, што яе ўжо няма. Праяжджаючы па Бялынiччыне са здымачнай групай, я вырашыў наведаць вёсачку, у якой жыла Фядора. Балазе гэта было па дарозе. На ўскрайку вёскі — сіні дамок збоч дарогі. Вялікі і пусты, маўклівы. Прасторны голы двор, адчыненыя весьніцы — і замок на дзьвярах. «Пасьля яе, тут, можа, ніхто і ня селіцца», — сумна падумаў, падняўся назад на шашу.

Двое ў джынсавых куртках, немаладыя мужчына і жанчына, нетаропка набліжаліся аднекуль з цэнтру вёскі. Я рушыў ім насустрач, мяркуючы распытаць, дзе тут менавіта жыла Фядора. «Чаму «жыла»?» — асьцярожна спытаў мужчына, схілены пад цяжарам сумкі. «Здаецца ж, яна мёртвая, так?» — гэтак жа асьцярожна і нягучна сказаў я. «Бог з вамі!» — ён схапіў мяне за руку, нібыта спрабуючы ласкава і выключна з выхаваўчымі мэтамі пабіць за глупства. Гэтыя двое аказаліся з Масквы, прыехалі да Фядоры. Зь беларускай лекаркай зьвязаліся праз свайго знаёмага, філёзафа і акадэміка Сыпіркіна — таго самага, па чыіх падручніках любілі вучыцца студэнты ў савецкія часы. Няўклюдна апраўдваючыся за сваё няведаньне, вяртаюся разам з масквічамі на ўскраек вёскі. Тут мне паказваюць адчыненыя жалезныя вароты, за якімі агромністы чырвоны цагляны дом адступае ў засень лесу, абкружаны акуратнымі аднолькавымі хлеўчукамі і такім самым чырвонацагляным летнікам.

Як я хутка даведаўся, у летніку Фядора прымае наведнікаў, а ў хлеўчуках жывуць тыя зь іх, хто застаецца лячыцца на доўгі тэрмін. І як высьветлілася таксама, той сіні маўклівы дамок таксама быў ейны, але некалькі гадоў таму яна пакінула яго.

Слава пра Фядору Конюхаву зь Пільшыч, што ў Бялыніцкім раёне, пад Магілёвам, апанавала гэты край у 1980-я.

Мае бацькі мелі дачу ў суседняй вёсцы, з бээнэфаўска-брэжнеўскай (у залежнасьці ад мовы прачытаньня) назвай Адраджэньне/Возрождение. У тыя 80-я, неяк пачынаючы з аднаго лета, наша даволі глухая лясная шаша ператварылася амаль у сталічную магістраль. Людзі ехалі з усяго Саюзу. Нядзіўным стала, напрыклад, злавіць спадарожную машыну да станцыі з казахскімі, уральскімі нумарамі. Бум пачаўся пасьля артыкулаў у сталічных газэтах, дзе пра Фядору часьцяком гаварылася поруч з тагачаснымі супэрзоркамі тэлегіпнозу Кашпіроўскім і Чумаком. Толькі Фядора якраз не гіпнатызёр, хоць, паводле яе слоў, менавіта гэтыя здольнасьці заўважыла ў ёй маці, сама дачка гіпнатызёра. «Мая бабуля была добры гіпнатызёр», — расказвала мне потым Фядора, і ад гэтай памылкі павеяла нейкай натуральнай прастатой, якая якраз і падкупляе.

У 90-я народ схлынуў, Пільшычы спусьцелі. Пра Фядору Конюхаву так доўга маўчалі, што пасьпелі забыць, а прыгадваючы, губляліся, ці жывая яшчэ гэтая Фядора.

«Пра мяне часам пішуць, што я памерла», — скардзіцца яна, разумеючы, аднак, пад гэтай маўклівай змовай газэт ня столькі памылку, колькі нядобры чын нядобрых людзей. Алею ў агонь падлілі тыя масквічы. У артыкуле тамтэйшай газэты — зь якога, уласна, сямейная пара і пачала шукаць Фядору — пра беларускую самабытную лекарку пісалася мала што ў прошлым часе, дык і называлі яе Фёклай.

Да прыезду сюды апроч цьмяных згадак пра нейкую зараджаную ваду з калодзежу я пра Фядору ня чуў нічога канкрэтнага. Не траплялася, не шукаў. У маёй пурытанскай сям'і адэпты нетрадыцыйнай мэдыцыны атрымлівалі адзін агромністы ярлык людзей падазроных. Хоць Кашпіроўскага глядзелі, пакуль яго не раскрытыкавалі ў прэсе. Чумаку ўжо ня верылі.




Пакуль мы ставілі сваю машыну, масквічы прайшлі ўперад, і праз пару хвілін сустракаць нас выйшла высокая жанчына ў плямістай летняй сукенцы. Спакойны, засяроджаны твар зь вялікімі цёмнымі вачамі (падчас размовы зь Фядорай я глядзеў ёй у вочы амаль не адрываючыся, але, нягледзячы на гэта, не магу з пэўнасьцю сказаць, карыя ў яе вочы ці ўсё ж цёмна-цёмна-сінія), манера гаварыць спакойная, голас глыбокі. Густая капа чорных, зь сівізной валасоў на плячах. Увесь яе вобраз адначасова ўнушыў давер і ўпэўненасьць. «Ці ня вас я шукаў?» — пытаюся яшчэ здалёк. Мякка ківае галавой: «Мяне».

Размаўляем доўга. Расказвае пра тое, як адкрыла незвычайныя якасьці вады, што крыніцай б'е каля яе хаты. Што ў маладосьці яшчэ, жывучы ў Казахстане, давала нейкай «яснавідзенцы» — так яна называла людзей, што перажылі невылечныя хваробы і пасьля гэтага атрымалі «сілу», — пакаштаваць вады зь мясцовай алма-ацінскай лячэбнай крыніцы. Не ўзяла. Давала пакаштаваць вады з крыніцы з кіеўскай Лаўры, дзе пахаваны Сергій Раданескі. Узяла шклянку, але асьцярожна, толькі двума пальчыкамі.

> «Наша зямля — самая сьвятая зямля, і наш народ, беларусы, — самы сьвяты і самы чысты народ», — цьвёрда, як агітатар, толькі з запалам зусім іншага кшталту гаворыць Фядора.

— У нас каля дому ў Пільшычах я капала калодзеж і знайшла старую кладку, — апавядае далей Фядора. — Гэтай кладцы — дзьве тысячы гадоў. Так сказаў мне мой дзед, калі явіўся ў сьне. Я падумала, што калі крыніцы Сергія Раданескага (Фядора называе яго Раданежанскім, навяваючы лёгкія моўныя алюзіі) 600 год і яе ўзяла «яснавідзенка», то што будзе, калі даць вады з маёй крыніцы, якой дзьве тысячы год. Паставіла шклянку з алма-

ацінскай, з кіеўскай і сваёй вадой, дык маю ваду ўзяла дзесяцьцю пальцамі.

Паказвае, як узяла.

Аповед пра ваду — толькі прэлюдыя.

Цягам размовы не магу пазбыцца разгубленасьці. Розум скептыка-матэрыяліста мусіў бы прыняць размовы пра зьяўленьні дзеда ў сьне, пра «яснавідзенку», пра галасы і ўсё такое праявай канкрэтнай псыхічнай хваробы. Тым больш, Фядора трапляла ў моцную аварыю. Але дзе ўзяць такі розум скептыка-матэрыяліста ва ўмовах, калі сама рэальнасьць суе табе пад нос пярэчаньні звыкламу матэрыялістычнаму сьветапогляду? У вобразе хоць бы гэтага выкладчыка пэдагагічнага ўнівэрсытэту зь Менску, кандыдата навук, зь якім мы пазнаёміліся ў Фядоры праз паўгадзіны пасьля маёй размовы зь ёй.

Праводзячы нас з апэратарам да ляснога калодзежу зь «Фядорынай» вадой, ён па дарозе дзеліцца з намі сваім разломам у сьвядомасьці. Раней ня верыў ні ў што «такое». Дактары знайшлі ў яго рак. Лячыўся. Пасьля другога сэансу хіміятэрапіі лекары адмовіліся працягваць лячэньне, бо ад «хіміі» быў унутраны крывацёк. На пытаньне выкладчыка «Што ж мне рабіць цяпер?» прафэсар мэдыцыны параіў — шукай якую бабку. Вось ужо пяць месяцаў прыяжджае сюды, на два-тры дні, як параіла Фядора. Самаадчуваньне добрае, не прымае ніякіх лекаў, хоць людзі, якія ляжалі зь ім разам у больніцы і мелі аднолькавую стадыю хваробы, ужо ня могуць абыходзіцца без болепатольнага і прайшлі па трэцім курсе хіміятэрапіі. Расказвае, што прывозіў сюды пляменьніка са зламанай нагой і нага загаілася за дзесяць дзён, хоць дактары давалі тэрмін на лячэньне два месяцы. Расказвае, што бачыў тут, у Фядоры, чалавека на чацьвёртай стадыі раку, які першыя дні ляжаў, ня ў сілах варухнуцца, а празь некалькі дзён ужо сам сеў у машыну.

Слухаючы яго, не магу не запярэчыць унутрана — усе падобныя выпадкі можна растлумачыць і ў межах сучаснай мэдыцыны. Моц унушэньня, перамяшаная з натуральным чалавечым страхам і спадзевам на звышнатуральнае, мабілізуе ўнутраныя глыбінныя сілы арганізму. І тут жа гэтаму пярэчаньню пярэчыць новае. Што перашкаджае традыцыйным мэдыкам узбуджаць такія сілы ў чалавеку?

Праз пару дзён рэшткі скепсысу зьнішчаюцца самі сабой, калі знаёмлюся са спэцыяльнай літаратурай. Зь Фядорай Конюхавай працавалі Акадэмія навук СССР, Інстытут радыётэхнікі і радыёэлектронікі, Усесаюзны навукова-дасьледчы і выпрабавальны інстытут мэдыцынскай тэхнікі Міністэрства аховы здароўя СССР, катэдра шпітальнай хірургіі Ўнівэрсытэту дружбы народаў, Сусьветная асацыяцыя народнай мэдыцыны. Усе заключэньні паўтаралі адну ідэю: фэнамэнальныя здольнасьці, надзвычай моцнае біяполе, гаючыя здольнасьці навукай пацьвярджаюцца, але не тлумачацца. Бескантактным узьдзеяньнем рук, вадой з сваёй крыніцы і накладаньнем гліны лячыла рак, пераломы, раны, экзэмы, дыятэз. Агромністы пералік дасьледаваньняў вучонымі беларускага фэномену завяршыўся прапановай праверыць здольнасьці Фядоры Конюхавай у асяродзьдзі, пазбаўленым гравітацыі. «Гэта што, ў космасе? Хопіць зь мяне, паеду ў Пільшычы, капаць крыніцы», — так перадаюць газэты рашэньне Фядоры вярнуцца на радзіму, не зважаючы на шалёную цікавасьць да яе самых разных навуковых арганізацый. У асабістай размове Фядора пра гэтае рашэньне дадае — у сьне прыйшоў нездаволены дзед, сказаў, што хопіць бавіцца ў гэтай Маскве, дома крыніцы чакаюць, трэба людзям дапамагаць.

## Чумак і Кашпіроўскі

**Пры канцы 80-х «экстрасэнсы» былі сапраўднымі зоркамі шоў-бізнэсу. Тагачасная індустрыя відовішчаў ня мела чаго проціставіць іх сэансам. Яны зьбіралі стадыёны. Пра іх складалі показкі. Алан Чумак дагэтуль практыкуе. Пасьля зьнікненьня з экранаў ён запатэнтаваў свой мэтад «энэргаінфармацыйнай зарадкі вадкасьцеўтрымальных субстанцый», пэрыядычна ладзіць у Маскве дармавыя сэансы. Акупаюцца яны дзякуючы продажу зараджаных тавараў. У асартымэнце — ня толькі памятныя крэмы і вада. У Чумака можна набыць зараджаную касэту, плякат, соль і нават фатаздымак, «для індывідуальных аздараўляльных сэансаў». Картачку рэкамэндуецца «каля 20 хвілінаў вадзіць уздоўж цела з акцэнтам на хворыя ўчасткі». Тэрмін дзеяньня — 6 месяцаў. Анатоль Кашпіроўскі у пачатку 90-х пайшоў у палітыку — быў абраны дэпутатам Дзяржаўнай Думы Расеі ад ЛДПР. Цяпер ладзіць лячэбныя сэансы па Расеі і Ўкраіне.**

**СТ**

«Наша зямля — самая сьвятая зямля, і наш народ, беларусы, — самы сьвяты і самы чысты народ», — цьвёрда, як агітатар, толькі з запалам зусім іншага кшталту гаворыць Фядора. Для яе гэтая выснова — зразумелая сама сабой ісьціна, якая вынікае зь бясспрэчнай сілы вады, што выцякае з гэтай зямлі. «Алма-ацінская вада слабая, — зноў і зноў прыгадвае свой экспэрымэнт зь «яснавідзенкай», — таму што ў іх вера не хрысьціянская». Вада ад крыніцы Сергія Раданескага крыху мае сілы, але, паводле слоў Фядоры, выключна таму, што каранямі айцец Сергій зь беларускай зямлі.

Тут спрадвечна жылі беларусы, паказвае яна на сваю пяльшыцкую зямлю. І вядзе прарадзіму беларусаў ад Бялыніччыны да Менску, бо менавіта ў Менску, у адным парку, яна ў свой час адчула такі самы наплыў сілаў, што й на сваіх крыніцах. Ідэя «этнічна і рэлігійна самых чыстых і сьвятых беларусаў» зь яе вуснаў гучыць як здаровы народны нацыяналізм з мэтафізычным абгрунтаваньнем. Расейцаў ня любіць: ад іх беларусы толькі разбэшчанасьць успрынялі. Ад іх, напрыклад, навучыліся лаўкі варочаць і платы ламаць на Купальле. «Расейцы — гэта ня тое, — гідліва маша рукой, — у іх вайна, гвалт, беспарадак. Дарма што праваслаўныя».

Мог я не папрасіць Фядору мяне паглядзець?

Страх, чымсьці падобны да страху героя ў таго мультфільму, дзе «ён нас падлічыў!», прайшоў даволі хутка. Паслухмяна варочаюся на кушэтцы.

Жывот. Сьпіна. Кажа мне, што ўва мне ёй не спадабалася. Пад канец заўважае, што ў мяне была траўма галавы. Зь цяжкасьцю прыгадваю, як у юнацтве цягаў рукой эспандэр, прыціскаючы яго другі канец нагой да падлогі, як гэты канец сарваўся з нагі і закончыў напружаную дугу на маёй макаўцы. Ад болю я тады хвілін дзесяць курчыўся на падлозе, але ніколі не лічыў гэта страсеньнем мазгоў, як яна сказала. Не ванітавала, не адключаўся, хоць трохі пацямнела ў вачах. За мной па дыягназ прасіцца наш кіроўца. Ён нядаўна пасьля апэрацыі, трэба ж ведаць, як усё загаілася.

На развітаньне дзякуем, на што Фядора гнеўна прыкрыквае кіроўцу, каб ніколі не казаў «спасибо», бо Бог не можа стаяць у канцы слова. «Спасибо» ў кішэнь кладзі, а мне кажы «благодарю». Пытаюся — а «дзякуй» можна?

— А «дзякуй» я табе ў нос цюкну, «дзякуй» твой. Толькі «благодарю».

Гэта, напэўна, адзіная навука з таго візыту, прымаць якую я не зьбіраюся.



АЛЯКСАНДАР АРЦЕМЬЕЎ

**Уверсе — Фядорын двухтысячагадовы калодзеж, унізе — новая сядзіба.**



АЛЯКСАНДАР АРЦЕМЬЕЎ

АСОБА

# 32-гадовы япіскап БАПЦ

30 траўня ў царкве Жыровіцкай Маці Божай у Гайлэнд-Парку (штат Нью-Джэрзі, ЗША) адслужыў першую багаслужбу япіскап Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы Васіль, які стаў наймаладзейшым ярархам БАПЦ, што дзее ў Амэрыцы. Сталі вядомыя некаторыя падрабязнасьці.

Уладыка Васіль (у сьвецкім жыцьці Віктар Касьцюк) нарадзіўся 11 верасьня 1971 г. у Пінску. Скончыў у 1995 г. Менскую духоўную сэмінарыю са ступеньню бакалаўра багаслоўя, з 1995 да 1999 г. вучыўся ў Маскоўскай духоўнай акадэміі, якую скончыў са ступеньню кандыдата багаслоўя, напісаўшы — і выдаўшы асобнаю кнігаю — працу «Гісторыя Пінскае япархіі (1921—1944)». У тым самым годзе прыняў манаскі пострыг пад імем Васіль і быў высьвячаны на іерадыякана. Працаваў выкладчыкам літургікі ў Менскай духоўнай сэмінарыі, што ў Жыровічах.

Сайт Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы зазначае, што Васіль «пасьля году выкладчыцкае працы, ня змогшы дзеля антыбеларускага настаўленьня ярархіі Маскоўскага патрыярхату абараніць падрыхтаваную ім на атрыманьне дактарату дысэртацыю «Гісторыя праваслаўя на беларускім Палесьсі (X—XX ст.)», пакінуў Жыровічы й вярнуўся ў родны Пінск». Праз нейкі час ён наладзіў сувязі зь мітрапалітам Ізяславам (Бруцкім) і Кансысторыяй БАПЦ, на запрашэньне якіх і прыехаў у ЗША.

Сталася так, што за дзень Васіль прайшоў шлях ад іерадыякана да архімандрыта: 7 сакавіка мітрапаліт Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы Мяфодзій (Кудракоў) высьвяціў яго ў сьвятары і ўзвысіў у годнасьць ігумена, а затым — пры канцы сьвятой літургіі — архімандрыта.

20 сакавіка Мяфодзій з архіяпіскапамі Віньніцкім Раманам і Чаркаскім Якавам у Цярнопалі высьвяцілі Васіля ў япіскапы БАПЦ з тытулам «япіскап Бруклінскі і Баранавіцкі». Васіль (Касьцюк) будзе служыць у катэдральным саборы сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне (Нью-Ёрк).

Такая хуткасьць пры высьвячэньні не ў навіну для БАПЦ. Напрыклад, Уладзімер Тамашчык быў высьвячаны ў біскупа ў 1949 г. пад імем Васіля па скарочанай працэдуры, і толькі праз два гады ён скончыў Украінскую праваслаўную тэалягічную акадэмію ў Мюнхене.

Парафія ў Гайлэнд-Парку, дзе працаваў св.п. япіскап Ізяслаў (Бруцкі) — адзін з найстарэйшых прыходаў БАПЦ у ЗША. Гісторыя БАПЦ, як і беларускай праваслаўнай царквы на эміграцыі ўвогуле, яшчэ чакае свайго дасьледчыка, які б разабраўся у складаных дачыненьнях, дзе часам на першы плян выходзілі не канцэптуальныя спрэчкі кананічнасьці/некананічнасьці, а асабістае.

**Эдвард Людовіч**

*P.S.* Цікавы нюанс. У гасьцявой кнізе сайту гораду Пінску ёсьць паведамленьне: «Епископ Бруклинский Василий (Костюк), Нью-Йорк. Спасибо за сайт о моем родном городе».

## Самая танная «НН»

«Наша Ніву» зь мінімальнай нацэнкай па цане **550 рублёў** можна купіць у краме УП «Марат».

Менск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11А, 2-гі паверх. Ад 9 да 17, перапынак ад 13 да 14, тэл. 226-87-99.

## ХРОНІКА

Лідэр Гарадзенскай філіі АГП **Уладзімер Чырвоненка** 4 чэрвеня быў аштрафаваны на 7 базавых велічыняў (133 тыс.руб.): 7 красавіка яго затрымалі міліцыянты і хацелі наладзіцьператрус аўтамабіля, але Чырвоненка запатрабаваў прысутнасьці панятых і складаньня пратаколу — гэтыя дзеяньні былі кваліфікаваныя як «непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі». 11 чэрвеня падчас распаўсюду ўлётак быў затрыманы лідэр ГА «Пэрспэктыва» **Анатоль Шумчанка**. Актывістаў АГП **Зьмітра Коўшыка**, **Яўгена Данілава**, **Аляксандра Домаша**, **Сяргея Зубарава** затрымалі 16 чэрвеня ў Горадні падчас збору подпісаў у падтрымку галадаючых палітыкаў: А.Домаша адпусьцілі, астатніх пратрымалі ўсю ноч у пастарунку і ўранку адпусьцілі, аштрафаваўшы на 10 тыс.руб., але не прад'явіўшы абвінавачаньняў. Таксама 16 чэрвеня затрыманы ў Менску актывіст «Зубра» **Аляксандар Апраніч**, які распаўсюджваў улёткі пра галадоўку палітыкаў. 17 чэрвеня актывісты «Зубра» **Ўладзімер Лут**, **Іван Шутко** і **Яраслаў Касьцюкевіч** былі затрыманыя ў Жодзіне каля прахадной заводу БелАЗ падчас раздачы ўлётак з інфармацыяй пра галадоўку палітыкаў, затрыманых Міхаіла Марыніча і Валер'я Леванеўскага і асуджаную Аксану Новікаву. У міліцыі ў «зуброўцаў» забралі ўлёткі. Актывістку «Зубра» **Ірыну Бохан** затрымалі ў той самы дзень ў Менску каля Камароўкі, дзе яна раздавала ўлёткі, а **Паўла Юхневіча**, **Алега Радзюка**, **Аляксея Н.** і **Юлію Гарачку** — каля мэтро «Пушкінская». У Гомелі падчас акцыі пратэсту прадпрымальнікаў затрымалі кіраўніцу мясцовай філіі Свабоднага прафсаюзу прадпрымальнікаў **Тацяну Марчанку** і прафактывіста **Ўладзімера Няпомняшчых**. Актывіста «Зубра» **Мікіту Сасіма** 17 чэрвеня затрымалі ў Баранавічах і асудзілі на штраф 190 тыс.руб. за непавагу да суду: каля 3 месяцаў таму яго затрымалі ў Полацку і асудзілі за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, але штрафу хлопец ня выплаціў. Цяпер у Сасіма штомесяц будуць вылічваць па 9 тыс.руб. — гэта пятая частка ягонай стыпэндыі. 17 чэрвеня ў **Салігорскай філіі Беларускага Хельсынскага камітэту** пачалася праверка, наладжаная Камітэтам дзяржкантролю й Міністэрствам па падатках і зборах, — гэта трэцяя праверка з пачатку году. Намесьніку кіраўніка Агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў **Аляксандру Васільеву** 18 чэрвеня прад'явілі абвінавачаньне ў публічнай абразе прэзыдэнта, пакуль што ён знаходзіцца пад падпіскай аб нявыезьдзе. Бярозаўскі раённы суд 18 чэрвеня не задаволіў пазову дэпутаткі Белаазерскага гарсавету настаўніцы **Натальлі Акаронкі** пра скасаваньне вынесенай ёй вымовы, праз якую яе звольнілі з працы: дырэктар школы вынес ёй у лістападзе 2003 г. вымову за прапушчаныя занятткі, калі Н.Акаронка прысутнічала на сэсіі гарсавету. 19 чэрвеня ў Менску падчас распаўсюду ўлётак затрыманы актывіст «Зубра» **Максім Громаў**. За тое самае актывісткі «Зубра» **Любоў Кучынская** і **Кацярына Сьмірнова** былі затрыманыя 20 чэрвеня. У Барысаве 20 чэрвеня падчас раздачы ўлётак былі затрыманыя «зуброўцы» **Міхаіл Кандрашоў** і **Павал Мікуловіч**. Наваполацкі гарсуд 21 чэрвеня задаволіў пазоў праваабаронцы **Зьмітра Салаўёва** да інспэкцыі па падатках і зборах. Інспэкцыя аштрафавала Салаўёва на 190 тыс.руб. за тое, што 7 траўня ён не пусьціў супрацоўнікаў інспэкцыі ў свой офіс. Падчас суду высьветлілася, што прадпісаньне на правядзеньне праверкі было аформлена некарэктна, а таксама — што для правядзеньня праверкі не было законных падставаў. 22 чэрвеня за раздачу ля Дому ўраду зваротаў да дэпутатаў з патрабаваньнем зьменаў у выбарчым кодэксе пратаколы склалі на **Сержука Высоцкага** і **Васіля Парфянкова** зь незарэгістраванай Беларускай партыі свабоды і на **Алеся Васілеўскага** зь незарэг. Маладога Фронту.

**АШ**

## Ініцыятыва

Прапаную распачаць вельмі неабходную акцыю «Бясконцы ланцуг праўды», сутнасьць якой у наступным: прачытаўшы чарговы нумар «НН», не кладзіце яго ў газэтніцу і не выкідайце. Перадайце газэту знаёмаму ці суседу, які ня мае магчымасьці яе набыць. А лепей укіньце газэту ў паштовую скрыню незнаёмага вам чалавека! Таксама, калі ў вас ёсьць мажлівасьць, зрабіце ксэракопіі карысных матэрыялаў газэты і распаўсюдзьце (па скрынях). Кожны сьвядомы чалавек будзе ўдзячны вам за гэтую дабрачыннасьць.

**Юрась Бусел, Маладэчна**

## Падручнік з выбрыкамі

Кожны год нам выдаюць падручнікі. Большасьць зь іх ужо патрыманыя. Напрыклад, мой падручнік беларускай мовы прайшоў праз дзясятак рук. Кожны пакінуў пасьля сябе памяць, спадчыну, свой аўтограф: малюнкі са зброяй, надпісы, непрыстойнасьці — азадкі з прычындаламі. А на малюнку кабінэту беларускай мовы напісана: «Опасно». У 173-м практыкаваньні, дзе прапанавана паглядзець плян па сэрыі малюнкаў і скласьці свой плян, намаляваны, калі гаварыць па-ангельску, сэкс-шоп. І гэтак скрозь, амаль на кожнай старонцы. А колькі я меў пакутаў пры выкананьні заданьняў у практыкаваньнях! Вось практыкаваньне №342. Першы сказ цалкам замаляваны белым карэктарам. Тое самае і зь некаторымі літарамі. Незразумела, мядзьведзь ці то пляскаў, ці то ляскаў лапамі ў сьнег, бо першая літара замаляваная тым жа белым карэктарам. У параграфе 24 «Прошлы час дзеясловаў» закрэсьлена літара «р». І чытаецца: «Пошлы час дзеясловаў». Вось як пастараліся мае папярэднікі — колішнія ўладальнікі падручніка. Я лічу, што лепей такія падручнікі дзецям не выдаваць.

**Сержык Чылікін-Садэльскі, школьнік, Менск**

## Вартасьці і недахопы тэставаньня

Добраахвотнае тэставаньне па беларускай мове, якое адбылося 8 траўня гэтага году, мела вялізную колькасьць недахопаў, хаця нельга не прызнаць, што былі і пэўныя вартасьці: пры дапамозе тэставаньня кожны меў магчымасьць датэрмінова здаць іспыт нават у ВНУ ці проста выпрабаваць свае здольнасьці.

Што да недахопаў, тут усё больш складана. Па-першае, тэсты распрацаваны так, што веды, якія патрабуюцца нават для добрай здачы экзамэну, можна набыць хіба толькі ў лінгвістычных каледжах ці гімназіях. Па-другое, тэставыя заданьні распрацаваныя недакладна, а прасьцей кажучы, утрымліваюць вялізную колькасьць памылак, што забіралі час, якога і так было ня надта шмат (110 хвілін на 40 заданьняў). Па-трэцяе, вобласьць блянка адказаў, прызначаная для рэгістрацыі, была на расейскай мове, што выглядала б сьмешна, калі б не было так горка. Тыя працаўнікі ўстаноў, якія распавядалі, як і што запаўняць у блянку адказаў, размаўлялі цалкам на расейскай мове. Гэта стварала вельмі дрэнную атмасфэру, якая перашкаджала сканцэнтравацца і думаць толькі пра тэст.

Мне больш за ўсё не спадабалася нават ня тое, пра што я казаў вышэй, а тое, што, калі мы запаўнялі вобласьць рэгістрацыі ў блянку адказаў, код прадмету тэставаньня ў беларускай мовы быў другім, а у расейскай — першым.

Аднак я не магу не адзначыць, што платнае тэставаньне па беларускай мове ў гэтым годзе выбралі 41129 чалавек — супраць 37689 чалавек, якія абралі расейскую мову.

**Алесь Мазанік,** удзельнік тэставаньня

## Дыктарам

О Божа мой, як далей жыць,
З Краінай што зрабілі!
На тэлебачаньні зусім
Мову сваю забылі.

Навіны чуеш кожны дзень
На рускай — чужой мове.
А ня трэба так рабіць,
Дыктары-панове!

На вуліцы няхай гавораць
На ўсялякай мове,
А з экрану хочам чуць
Родную, панове!

Радыё яшчэ нас цешыць —
Больш чуем роднай мовы.
Перад яго вядучымі
Кланяцца мы гатовы.

**Юзэфа Чантарыцкая,**
Альхоўка (Мядзельшчына)

## Паважаныя чытачы і прыхільнікі «Спадчыны»!

У падпісным каталёзе «Белпошты» на другое паўгодзьдзе 2004 г. вы знайшлі сваё ўлюбёнае выданьне пададзеным без азначэньня падпіснай цаны. Гэта азначае, што рэдакцыя «Спадчыны» прыняла няпростае, але адзіна магчымае ва ўмовах вялікага спазьненьня ў часе выхаду часопісу рашэньне: у 2004 г. зьмяніць пэрыядычнасьць і выйсьці 3 нумарамі, на якія вы ўжо падпісаліся. Тых, хто не пасьпеў аформіць падпіску на згаданыя 3 нумары 2004 г., запрашаем зьвяртацца непасрэдна ў рэдакцыю праз тэлефоны 280-07-97, 8-029-778-18-68 ці праз электронную пошту: p_university@open.by. Нумары за 2004 г. вы атрымаеце бліжэй да канца бягучага году, пасьля заканчэньня пляну выпуску 2003 г. (у найбліжэйшы месяц выходзіць нумар 2/3 за 2003 г.), а пры канцы 2004 г. у падпісным каталёзе-2005 знойдзеце «Спадчыну» са звыклай пэрыядычнасьцю выхаду.

**З павагай, рэдакцыя «Спадчыны»**

## Мы абвяшчаем поўную падтрымку Хведару Караленку

### Адкрыты ліст

9 чэрвеня завяршыўся суд над аўтарам фан-сайту ансамблю «Песьняры» Фёдарам Караленкам. Стваральнік прыгавораны да штрафу ў тры мінімальныя зарплаты. Пакараньне сымбалічнае — але ці ведае грамадзкасьць, у чым заключалася злачынства?

Магчыма, Фёдар са зброяй у руках абрабаваў сям'ю нябожчыка Мулявіна? Магчыма, ён анасаваў на сайце гастролі падробных «Песьняроў»? Магчыма, арганізоўваў гандаль, нажываючы прыбыткі на арганізаванай пастаўцы бутлегерскіх кампактаў? Не. Ягоны сайт карыстаўся папулярнасьцю як сярод аматараў творчасьці, так і сярод артыстаў ансамблю. На сэрвэры не ляжала ніводнага байту твораў «Песьняроў». Але — які жах! — на сайце можна было знайсьці спасылкі на сусьветныя рэсурсы, дзе пры жаданьні лёгка знайсьці файлы зь іх запісамі. Звычайная практыка любага рэсурсу — зьбіраць спасылкі на старонкі, блізкія па тэме і цікавыя карыстальнікам.

За гэта і абвінавацілі Хведара не артысты ансамблю (якія самі не валодаюць правамі на творчасьць «Песьняроў»), а Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства інтэлектуальнай уласнасьці (РУПІУ).

Як вядома, спасылка — асноўны інструмэнт існаваньня Інтэрнэту. Сусьветная сетка інтэрнацыянальная, і ў розных краінах існуе рознае заканадаўства ў галіне аўтарскіх правоў. Ніхто ня можа забараніць кітайскаму фанату беларускай групы выкласьці ў Інтэрнэт файлы з запісамі, калі гэта не забаронена законамі яго краіны. Калі файлы ёсьць у глябальнай сетцы — іх можна знайсьці на працягу 10 хвілін, з дапамогай Хведара Караленкі ці безь яе.

Відавочна, што ў гэтым выпадку судзіць за забесьпячэньне доступу да «неліцэнзаваных» файлаў трэба было не аматара «Песьняроў» Хведара Караленку. А ні многа ні мала — судзіць і забараняць саму тэхналёгію Інтэрнэту. Ці можна асудзіць тэхналёгію?

Гісторыя ведае шмат выпадкаў, калі новыя тэхналёгіі ня ўпісваліся ў рамкі заканадаўства і асуджаліся. У часы інквізыцыі былі забаронены паталягаанатомія і астранамічныя назіраньні. Фэадальныя правілы дарожнага руху (з аднаго пункту — «Воз селяніна саступае дарогу каню двараніна») са зьяўленьнем аўтамабіляў аказаліся непрыдатныя. Сёньня мы назіраем спрэчку, што ж важнейшае для грамадства — тэхналёгіі, якія даюць свабоду інфармацыі, ці правы «інтэлектуальнай уласнасьці», што дзейнічаюць паводле шаблёнаў мінулага стагодзьдзя.

У канкрэтнай сытуацыі крайнім аказаўся ня толькі Хведар Караленка.

Пацярпелі ўсе беларускія карыстальнікі. Фактычна ўсяго толькі за РАСКАЗ адзін другому пра тое, што і дзе знаходзіцца ў сусьветнай сетцы, кожны з нас цяпер можа быць прыцягнуты да суду. Дастаткова толькі, каб агенцтва РУПІУ палічыла, што ў выніку такога расказу хто-небудзь патэнцыйна МОЖА адмовіцца ад пакупкі іх дыску. Прыгадваючы закон пра аўтарскія правы, ці памятаюць яны пра закон аб абароне правоў спажыўцоў? Ці мае чалавек права перад пакупкай дыску азнаёміцца зь яго зьмесьцівам? Ці трэба судзіць прадаўца, які расказвае пакупніку, дзе можна бясплатна панюхаць адэкалён, які той зьбіраецца купіць?

Інтэрас РУПІУ ў гэтай справе відавочны — прадпрыемству трэба апраўдваць сваю назву і насаджаць у нас у краіне «інтэлектуальную ўласнасьць» паводле амэрыканскага ўзору. Паводле ўзору, які ўжо і ў краінах, дзе ён дзейнічае, зьведвае надзвычай жорсткую крытыку. Крытыку за неадпаведнасьць патрабаваньням часу. За спробу падпарадкаваць прагрэс патрабаваньням звышпрыбыткаў. За небясьпеку абмежаваньня правоў паспалітых спажыўцоў з адной толькі мэтай — любой цаной захаваць устарэлыя схемы спажываньня-ўзнагароджваньня і «ўсьляпую», безь ніякіх зьмен перанесьці іх у новыя тэхналягічныя галіны.

Для таго каб адвучыць людзей ад таго, што яны ўсё сваё сьвядомае жыцьцё лічылі нармальным, — дзяліцца ўлюбёнай музыкай зь сябрамі, — трэба запусьціць карны апарат і каго-небудзь паказальна пакараць. Менавіта для такога паказальнага судзілішча і быў выбраны папулярны і гранічна карэктны сайт «Pesnyary.com» — калі ўжо за яго ніхто не заступіцца, дык астатнія камэрцыйныя праекты можна будзе перасьледаваць і «караць рублём» зусім беспакарана.

Мы лічым, што стварэньне і ўкараненьне заканадаўства ў галіне IT шляхам сьляпога перанясеньня на нашу глебу імкліва старэючых паняцьцяў «інтэлектуальнай уласнасьці» і мэханізмаў іх забесьпячэньня — тупіковы шлях. Мы заклікаем РУПІУ, Ігара Лучанка і Сьвятлану Пенкіну адмовіцца ад дыскрэдытацыі творчасьці «Песьняроў», ня зводзіць пытаньняў культурнага набытку краіны і яго даступнасьці народу да пытаньняў банальнай нажывы. Мы заклікаем пазоўнікаў — цяперашніх і патэнцыйных — публічна адмовіцца ад перасьледаваньня некамэрцыйных праектаў, якія не нясуць прамой пагрозы матэрыяльнаму дабрабыту аўтараў і спрыяюць папулярызацыі творчасьці артыстаў. Мы абвяшчаем поўную падтрымку Хведару Караленку.

**Дзьмітры Барадаенка, аглядальнік газэты «Компьютерные вести»; Віталь Хілько, Менск, праграміст; Сяргей Бальшакоў, Обнінск (Расея), праграміст; Сьвятаслаў Сьвірыдаў; Яўген Сакалоў, студэнт; Аляксандар Міхаілян, Брусэль, праграміст; Уладзімер Шахаў, выкладчык БДУІР; Аляксей Хлебнікаў, Менск; Сяргей Пагуда, сыстэмны адміністратар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі; Дзьмітры Адамушка, праграміст; Сямён Кулік, праграміст; Алесь Няхайчык, сыстэмны адміністратар; Уладзімер Вараб'ёў, Менск; Аляксандар Бутэнка, сыстэмны адміністратар Нацыянальнага цэнтру інфармацыйных рэсурсаў і тэхналёгій; Міхаіл Шыгорын, Кіеў, IT-мэнэджэр; Глеб Рубанаў, Менск, асьпірант; Мікалай Прылуцкі, Менск, акцёр тэатру імя Я.Купалы; Дзьмітры Масьлікаў, Масква (Расея), фінансавы кантралёр; Уладзімер Міхневіч, Варшава, кампутарны дызайнэр ды іншыя.**

**Андрэй Дынько, рэдактар «НН»; Андрэй Скурко, намесьнік рэдактара «НН».**

**Подпіс можна паставіць па адрасе: http://mlug.linux.by/cgi-bin/index.cgi?action=search&search=SignKorolenkoLetter.**

## ВОДГУКІ

## «За крок ад мары»

Мяне зьдзівілі памылкі ў артыкуле «За крок ад мары» («НН» №21). Сэзон каманда Пунтуса пачала не на Мальце, а ў Партугаліі. На Мальце адбываўся іншы турнір, там беларуская моладзь змагалася з нацыянальнымі зборнымі Мальты, Эстоніі ды Малдовы і заняла першае месца. У генэральнай рэпэтыцыі ў Менску беларусы перамаглі швайцарцаў зь лікам 4:1, а не 4:0. Не Джыльярдзіна з «Пармы» стаў найлепшым бамбардзірам італьянскай сэрыі «А» (ён забіў 23 галы), бо ўкраінец Шаўчэнка («Мілян») забіў 24 галы. Глеб трапіў летась у тройку не найлепшых легіянэраў чэмпіянату, а ўвогуле ўсіх гульцоў. Ён саступіў толькі бразыльцу Элбэру ды немцу Балаку.

Пра спорт трэба пісаць дакладней, бо гэта ня тая сфэра, якой нацыянальныя сілы могуць бясконца грэбаваць.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца (Барысаўшчына)**

## «Čyj apostał i hienij»

Chaču adhuknucca na dyskusiju vakol artykułu A.Sidareviča «Čyj apostał i hienij?» («NN» №20). Šanoūnaja spadarynia Zdanovič! Daremna Vy napadajecie na Sidareviča. Jahony artykuł — pra rolu asoby ū historyji. Tamu pra mastaka zhadvaje mimachodam. Ja ž pačnu z mastactva.

Adnojčy ja prystaū da studenta Akademii mastactvaū: jak paznać, što peūny tvor adnosicca da biełaruskaha mastactva? Kali heta naturmort z ručnikom ci batalnaja scena ź Vitaūtam — tam usio jasna. A kali heta prosta sini trochkutnik? Składanaje pytańnie. Toj student uchiliūsia: «Mastactva nia maje nacyjanalnaści». Pry tym što jon prachodzić kurs historyji mastactva, dzie siarod usialakich kvatračentaū dy kvintačentaū jamu ūbili ū hołaū jasny padzieł na italjanskaje, francuskaje dy inšyja mastactvy. A takija vyklučeńni, kali na tvorčuju spadčynu hišpanskaha žyda Pikasa pretendujuć jašče i francuzy, tolki abvastryli prabliemu «čyj apostał i hienij», a nie razmyli nacyjanalnyja miežy.

Łarysa Hienijuš, prajšoūšy HUŁAH, pakinuła vieršy, dzie ščyra (a nie ezopavaj movaj) vykazała svajo staūleńnie da movy akupantaū. Siońniašnija kinematahrafisty stvaryli film pra Hienijuš na rasiejskaj movie. Nie vianok, a plavok na mahiłu.

Heta što da pašany miortvych, «asabliva na adlehłaści».

U historyi zastaūsia fakt: Anton Łuckievič nie padavaū ruki Ruščycu. A jak mnie pavodzicca z sučasnymi ruščycami? Zapeūnić bahinjū Klio, što jany ničym nia roźniacca ad sučasnych Łuckievičaū, što heta adzin narod?

Mnie nia vieryłasia, što ja samotny ū takich dumkach. Ja pryhladaūsia da publikacyj u «NN». I voś narešcie dačakaūsia. Dziakuj Vam, dziadźka Anatol! Vaš artykuł «Čyj apostał i hienij?» mnie vielmi blizki.

**Hienik Łojka, Miensk**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Чаму адным замежныя мовы даюцца лёгка, а іншым — цяжка

Большасьці з нас цяжка даюцца замежныя мовы. Шмат хто цягаецца па розных курсах, завучвае словы і выразы, але жаданага выніку не атрымлівае. Эўропа набліжаецца, а мовамі большасьць з нас, нягледзячы на навучаньне ў школе ды нават у інстытуце, так і не авалодала. Нават расейская, якую вучаць усе і як мінімум на працягу ўсіх школьных гадоў, з вуснаў беларуса аддае тутэйшым акцэнтам. Як правільна вывучаць замежныя мовы?

Дасьледчыкі моваў могуць даць цяпер некалькі добрых парад. Тычацца яны ангельскай мовы, але выкарыстоўваць іх магчыма пры навучаньні любой, нават беларускай ці расейскай.

Кожны з нас ведае са школы: чым больш завучыш слоў, тым лепш. Шмат хто пачынае чытаць кнігі са слоўнікам, думаючы, што так і слоўцы завучваюцца, і тэкст разумееш. Аднак у сапраўднасьці такая навука нічога не дае — бо шуканьне слоў займае час і адрывае ад кантэксту. А перакладзеныя словы забываюцца на другі дзень. Спэцыялісты кажуць, што так вывучаць замежныя мовы ня варта.

Ня ўсе словы сустракаюцца аднолькава часта. Існуюць такія, якіх ніколі больш не напаткаеш, а іншыя пабачыш ці ня ў кожным сказе. Апошнім часам мовазнаўцы склалі адмысловыя даведнікі па выкарыстаньні слоў ангельскай мовы. З дапамогай кампутараў былі прагледжаны мільёны тэкстаў — ад звычайных размоў і нататак да SMS-паведамленьняў з электроннымі лістамі. Дзякуючы гэтаму сталася вядома, якія словы найчасьцей ужываюць дактары, а якія — сантэхнікі, як гавораць студэнты й як — чыноўнікі.

Каб здабыць тыя штодзённыя выказваньні, мовазнаўцам давялося выкарыстоўваць мэтодыку шпегаў. Бо, напрыклад, калі вам сказаць, што будуць запісваць кожнае ваша слоўца — ці будзеце вы казаць натуральна? Дазволу на выкарыстаньне запісаў навукоўцы пыталі пасьля самога запісу, тлумачачы, навошта гэта патрэбна. А дыктафоны працавалі ў розных месцах, нават у мэтро, кавярнях і лазьнях.

Гэткім чынам паўсталі вялікія базы зьвестак. Напрыклад, «World English Corpus» складаецца з 220 мільёнаў слоў, а найбольшы «COBUILD Bank of English» уключае 450 мільёнаў адзінак мовы. Словы туды ўключаны з ангельшчыны брытанскай, амэрыканскай, канадзкай, індыйскай ды іншых яе адгалінаваньняў.

Вывучаючы іх, прафэсары выявілі, што чужаземцу на вакацыях у Англіі для нармальнай штодзённай камунікацыі патрэбна ведаць ня больш як дзьве з паловай тысячы слоў. Амэрыканцы і ангельцы ўжываюць за дзень каля 5 тысяч выразаў.

Высьветлілася, што для разуменьня большасьці тэкстаў на 90% трэба ведаць толькі 7,5 тысячы словаў. Аднак, каб зразумець яшчэ 5%, давядзецца завучыць яшчэ 4 тысячы. А наступныя 2% дадуцца пасьля зубрэньня яшчэ 6 тысяч…

Таму лепш вучыцца разуменьню мовы з кантэксту, чым забіваць галаву ўсё новымі і новымі словамі, раяць ангельскія спэцыялісты. А калі апануеш той моўны мінімум, дык варта вырашыць для сябе, навошта табе чужая мова, і вучыць далей словы, зьвязаныя зь нейкай пэўнай галіной, напрыклад бізнэсам ці астраноміяй.

Цяпер пра тое, як вучыцца. Можна слухаць у хаце касэты. Але такая мэтодыка дасьць вынікі толькі дысцыплінаваным і стойкім. Іншыя хутка страцяць ахвоту. Лепш зь некім размаўляць. Як паказалі дасьледаваньні, чужую мову лягчэй зразумець, калі мы бачым суразмоўніка.

Віною таму так званыя люстэркавыя нэўроны, што месьцяцца ў нашым мозгу. Яны злучаюць вобраз з гукам. І, дарэчы, няма розьніцы, самі вы бераце асадку ці бачыце, што нехта іншы пацягнуўся па яе, — нэўроны адразу ж спрацоўваюць. Люстэркавыя нэўроны таксама адразу ж бяруцца за сваю справу, напрыклад, у галовах заўзятараў, калі тыя бачаць, як іх любімы футбольны нападаючы кідаецца да брамы суперніка. І няма розьніцы, дзе знаходзіцца заўзятар — каля брамы, на стадыёне ці на сваёй канапе насупраць тэлевізара. Зрок з дапамогай нэўронаў робіцца дадатковым каналам для перасылкі інфармацыі.

Ня мае значэньня для вывучэньня моў і ўзрост. Усё залежыць ад матывацыі. І словы «Я застары, каб вывучыць кітайскую…» — гэта толькі нагода нічога не рабіць. Хаця сапраўды, дзецям навука даецца лягчэй. Пасьля нараджэньня ўсе мы маем аднолькавыя здольнасьці для навучаньня любой мове. Аднак калі мы ня вучымся, гэта прыводзіць з часам да затуханьня магчымасьцяў і атрафаваньня адмысловых нэрвовых канчаткаў, якія адказваюць за адрозьніваньне чужой мовы. Менавіта таму дарослыя, што вывучылі мову, рэдка пазбаўляюцца акцэнту. Японцы ня здольныя адрозьніць «р» ад «л» — бо такога адрозьненьня ў японскай мове няма. Аднак і эўрапейцы ня ўмеюць вымаўляць шмат якіх гукаў зь японскай. А большасьць беларусаў ня могуць па-расейску правільна вымавіць «г» і «ч».

У сувязі з гэтым ці трэба пазбывацца акцэнту? Зразумела, не. Калі мы добра гаворым на чужой мове, але чуваць, што яна не зьяўляецца для нас роднай, дык часьцяком мы робімся сымпатычнымі суразмоўніку, кажуць псыхолягі. А калі нехта ўдае сябе за карэнных носьбітаў мовы і робіць памылку, дык толькі страчвае.

Лепей працаваць не над акцэнтам, а над дасканаласьцю мовы, бо вынікі камунікацыі больш важныя, чым ідэальнае вымаўленьне. Дый штораз часьцей здараецца, што мы размаўляем на чужой мове з чалавекам, для якога гэтая мова таксама чужая.

«Добра быць дзьвюхмоўным», — кажа шмат хто з нас, седзячы з падручнікамі й зайздросьцячы тым, хто другую мову ўсмактаў з малаком маці.

Мазгі немаўляткі складаюцца са ста мільярдаў нэўронаў. Прыкладна столькі ж зорак у Млечным Шляху. Для нас іх зашмат — частка зь іх гіне. Якія захаваюцца, залежыць ад асяродзьдзя, у якім расьце дзіця. На іх разьвіцьцё ўплывае вялікая лічба акалічнасьцяў і раздражняльнікаў. Яны арганізуюць розум, выключаюць злучэньні, якія ўжываюцца вельмі рэдка.

Актыўныя злучэньні, што праводзяць электрычныя імпульсы, выжываюць. Такое выхаваньне і навучаньне «высякае» ў сетцы нэрвовых клетак пастаянныя шляхі. Чым мы маладзейшыя, тым больш плястычны наш розум.

Вядома, што 80% інфармацыі за сваё жыцьцё чалавек засвойвае да 7 год. Ва ўзросьце 10—12 год ён ужо збольшага сфармаваны. Тады ўжо няма шанцаў, каб зрабіцца дзьвюхмоўным. Цэнтры, якія адказваюць за мову, фармуюцца ў першыя гады нашага жыцьця. Калі ў дзяцінстве да нас зьвярталіся толькі на адной мове, яна і арганізуе нэўронныя злучэньні. Розум «запісвае» ў нэўронах толькі адну граматычную, фанэтычную і сынтаксычную сыстэму.

Калі ж мы чуем ад нараджэньня дзьве мовы, дык ствараюцца і два раўназначныя цэнтры. А калі пачынаем вучыцца другой мове ў позьнім узросьце, другі цэнтар заўсёды будзе падпарадкаваны першаму. Розум ня будзе непасрэдна зьвяртацца да яго, а будзе карыстацца пасярэдніцтвам матчынай мовы. Прыкладна як праз перакладчыка. Чаму так? Гэта тлумачаць нэўрахірургі.

«Заўсёды перад апэрацыяй мы пытаем пацыента, дзьвюхмоўны ён ці аднамоўны, а таксама — калі вывучыў другую мову, — кажа Джой Хірш з «Memorial Sloan Ketterng Cancer Center». — Потым з дапамогаю магнітнага рэзанансу вызначаем, дзе ў мазгу знаходзяцца цэнтры, адказныя за абедзьве мовы, каб засьцерагчы іх ад скальпэля».

Хірургі выявілі, што ў чалавека, дзьвюхмоўнага ад нараджэньня, абедзьве мовы лякалізуюцца ў адным кавалку мозгу. Пашкоджаньне гэтага ўчастку выклікае праблемы з абедзьвюма мовамі. Калі ж пацыент навучыўся другой мове пазьней, дык месьціцца той участак асобна. Калі пашкодзіць яго які гуз ці апэрацыя, дык асоба страціць здольнасьць карыстацца чужой, але надалей будзе размаўляць на матчынай мове. Калі ж пашкоджаны ўчастак адказны за першую мову, дык карыстацца другой таксама будзе праблематычна.

Навукоўцы выявілі, што дзіцячы мозг у стане навучыцца дзьвюм мовам ня горш, чым адной. Аднак бацькам трэба быць асьцярожнымі: дзьвюхмоўе — гэта дадатковая нагрузка на дзіця, і хоць яно дае вялікія плюсы ў дарослым веку, пры супадзеньні зь неспрыяльнымі псыхічнымі абставінамі, у малога яно можа справакаваць моўныя дэфэкты, часовыя і сталыя.

А што рабіць, калі ты ўзяўся за навучаньне ў позьнім веку? Галоўнае ў вывучэньні замежнай мовы — гэта не пачынаць вучобу спачатку, калі раней ужо спрабаваў вучыць гэтую мову. Цяпер у Эўропе распрацаваны тэсты для большасьці моў, пасьля якіх лёгка выявіць, на якой прыступцы ведаў ты знаходзішся. І пачынаць далейшае навучаньне ўжо з гэтай прыступкі. Тэст аднолькавы ва ўсёй Эўропе.

Дарэчы, трэба сказаць, што 74% эўрапейцаў ня ведаюць ніякай замежнай мовы. Таму большасьці нашага насельніцтва таксама можна не бедаваць… Але ж як нам зь імі паразумецца?

**Руслан Равяка**

80% інфармацыі за сваё жыцьцё чалавек засвойвае да 7 год. Ва ўзросьце 10—12 год ён ужо збольшага сфармаваны. Тады ўжо няма шанцаў, каб зрабіцца дзьвюхмоўным.

## Як вывучыць мову: галоўнае правіла



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Раіць перакладчык Лявон Баршчэўскі, які ведае дзевяць замежных моваў: Калі ўжо ўзяўся вучыць мову, дык гэта трэба рабіць штодня, нягледзячы на абставіны. Ці там хвароба, ці падарожжа — слоўнік і падручнік павінны быць заўсёды з сабою. Засвоіць мову — значыцца засвоіць сьвет гэтай мовы.**

## Білінгв Багдановіч

Калі чалавек да сямі гадоў рос сярод расейскамоўных сваякоў, дык нават калі ён потым пасьля 16 год будзе размаўляць да старасьці па-беларуску, усё адно расейская будзе ягонай першай мовай. Аднак ён можа цудоўна валодаць беларускай, а ў выключных выпадках нават пісаць беларускія вершы. Прыклад таму — Максім Багдановіч.

Шэры афрыканскі папугай, якога эўрапейцы завуць жако, лічыцца самым здольным паліглётам сярод усяе свае радзіны. Так, жако Прудлі, занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса, за сваё жыцьцё вывучыў каля 1000 словаў. Генія літаральна знайшлі ў дровах: узялі малым з гнязда падчас высечкі лясоў ва Ўгандзе. Жыць папугаі могуць пры добрым даглядзе да 100 гадоў.





Самае вядомае тлумачэньне чалавечае шматмоўнасьці — легенда пра Бабілёнскую вежу. Руіны вялізнага збудаваньня можна дагэтуль пабачыць на левым беразе Эўфрату ля гораду Хілы (150 км на поўдзень ад Багдаду). Адно што цяпер Ірак — не найлепшае для турыстаў-эўрапейцаў месца. Насамрэч вежа, як мяркуюць навукоўцы, была зікуратам — бабілёнскім храмам, прысьвечаным богу Мардуку. Пра першапачатковыя памеры збудаваньня меркаваць цяжка: яго шматкроць бурылі й аднаўлялі. Паводле Робэрта Кольдвэя, археоляга, які яе адкрыў, вежа мела 90 м вышыні. Нават у сёньняшнім Менску такі гмах не згубіўся б.

## КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў), на старонку 16

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.

За кожныя наступныя 20 словаў — 4000 руб.

Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.

На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

Даведкі праз т. (017) 284-73-29

# Каляндар ліпеня

## Будслаў

1—2 ліпеня Будслаў сьвяткуе 500-годзьдзе. Нікім не даказана, што менавіта ў гэтыя дні ў 1504 г. руплівыя манахі-бэнэдыктынцы раскарчавалі дзялянку лесу ды паставілі сваю «буду» (адсюль і назва). Юбілей проста прымеркавалі да фэсту Маці Божай Будслаўскай — апякункі Беларусі. У праграме — урачыстыя мшы, рэлігійныя сьпевы і канцэрты. Мастак Алег Драбышэўскі зьбіраецца падараваць Будславу зробленую ім копію славутага абраза. Пілігрымка зь Менску ў Будслаў рушыць 27 чэрвеня з Пляцу Волі, ад Катэдры, а 8-й раніцы — пасьля імшы.

## Басовішча і ня толькі

Аматарам паганскіх сьвятаў 3 ліпеня варта быць у Белавежы, дзе Беларускае грамадзка-культурнае таварыства сьвяткуе Купальле. 31 ліпеня ў Гарадку — «Сябройская бяседа».

Але ж найбуйнейшай падзеяй на Беласточчыне мусіць традыцыйна стаца XV фэстываль рок-музыкі «Басовішча». На гэты раз канцэрты адбудуцца 23 і 24 ліпеня. У першы дзень — конкурс, а назаўтра — фінал. Сярод гасьцей фэстывалю — чацьвёрка «генэралаў», Кася Камоцкая, «Pomidor\off», «Zet», «Сьцяна», «IQ-48», «Deviation», «Indigo». З польскага боку ўдзел бяруць «Zero-85», «Hope On», «Judy-4», «Rima» ды «Triquetra». Дабрацца да Гарадка можна арганізавана на аўтобусах ці ехаць электрычкамі: спачатку да Берасьця, адтуль празь мяжу да Цярэспалю. А там кожны скажа, як ехаць на Гарадок.

Паслухаць «N.R.M.» таксама можна будзе і ў Менску разам з маладымі калектывамі 30 ліпеня.

## Славянскі базар

У Віцебску ўсе культурныя падзеі ўжо колькі год прывязваюць да «Славянскага базару», які з кожным годам усё больш усходнеславянскі, а месцамі нават славянарускі. З 15 да 21 ліпеня пройдзе трынаццаты «СБ». Праграма фэстывалю ня вельмі зьмянілася за апошнія гады: дні культуры Беларусі, Украіны і Расеі, конкурс маладых выканаўцаў, дзіцячы фэст, тэатральныя сустрэчы. У сталічным Палацы Рэспублікі таксама пройдзе канцэрт удзельнікаў «СБ». Кошт квіткоў на «базарныя» канцэрты вагаецца ад 3 да 80 тысяч. Самыя дарагія — на адкрыцьцё і закрыцьцё фэстывалю, а найтаньнейшыя — на дзень культуры Беларусі.

У ліпені таксама сьвяткуецца 1030-годзьдзе Віцебску. А ў межах «СБ» пройдзе славуты Шагалаўскі пленэр. Дзейнічае і своеасаблівая «фабрыка зорак»: штоліпень у тэатры імя Якуба Коласа праходзіць агляд народнай творчасьці. Дабрацца пляцкартам да Віцебску на цягніку ці на маршрутным аўтобусе каштуе блізу 14 тысяч. А вось зьняць пакой на «базарны» тыдзень абыдзецца ў 70—80 даляраў.

## Рытуальныя канцэрты

Гомель сёлета займее ўласны музэй вялікай айчыннай вайны. Адкрыцьцё чакаецца, вядома ж, 3 ліпеня.

Канал АНТ з 2 да 4 ліпеня праводзіць сэрыю канцэртаў «Землякі віншуюць Беларусь». Цікава, што «землякі» — акурат тое, што маем у якасьці 45 з 50% на FM, усе з Расеі: Майсееў, Сьвірыдава, «Машына часу», «Бі-2», «Начныя снайпэры». Зь мясцовых — Аляксандра Гайдук. Кошт квіткоў на менскі выступ на стадыёне «Дынама» ад 9 да 35 тысяч. Канцэрты таксама пройдуць 2 ліпеня ў Барысаве, а 4-га — у Магілёве і Берасьці. Галоўны канкурэнт АНТ Першы нацыянальны рыхтуе гістарычна-патрыятычную акцыю «Плошча Перамогі», якая 3 ліпеня пройдзе на аднайменным менскім пляцы. Там можна будзе ўбачыць усіх беларускіх артыстаў плюс салют.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Ліпень + адрэналін


АРТУР ПРУПАС

Калі хочаце атрымаць порцыю адрэналіну, то маецца шэраг экстрэмальных забаў. Аўтааматарам прапануюцца «Street racing» — гонкі навыперадкі па гарадзкіх вуліцах. Напрыклад, начныя «рэйсэры» зьбіраюцца штосуботу а 20-й каля 15-га корпусу БНТУ, у той жа дзень ёсьць тусоўка каля ГД «Дэкорум» а 19-й. Ёсьць і закрытыя гонкі, куды трапляюць толькі сябры адмысловых клюбаў.

Яшчэ адна гарадзкая забава — гульня «Схватка». Сутнасьць яе ў тым, каб выканаць за некалькі гадзін шэраг заданьняў. Прычым могуць прымусіць залезьці ў каналізацыйны люк ці на дах жылога дому. У каманду «Схваткі» абавязкова ўваходзіць штурман, з кампутарам у Інтэрнэце.

Калі хочацца больш спакойнага адпачынку — зьвяртайцеся ў конныя клюбы. Адзін зь іх — «Алюр» — знаходзіцца зусім непадалёк ад 10-й бальніцы. Ёсьць вядомая конная гаспадарка ў Ратамцы. Каб замовіць каня для катаньняў, дастаткова толькі патэлефанаваць. У Баравой знаходзіцца аэраклюб. Там можна замовіць скачок з парашутам.

## Нарач і Браслаўшчына

Самы танны адпачынак на Нарачы сёлета каштуе 8 у.а. за суткі. За стандартны заезд на 21 дзень выходзіць 168 у.а. Гэта сума толькі за пражываньне ў гатэлі ці пансіянаце і трох-/пяціразовае харчаваньне. Санаторый з нумарамі «люкс» пад Баранавічамі ці Менскам каштуе 560000 за 12 дзён. Вядома, усё ўключана. За 50 у.а. на 8 дзён выправіцеся на Браслаўшчыну ў катэджы, праўда, харчаваньне прыйдзецца забясьпечваць самастойна. Гатэль клясы «люкс» ці «паўлюкс» там каштуе прыкладна 21000 на чалавека ў суткі (аднамясцовы ці двухмясцовы нумар). У Белавежы такі адпачынак пацягне на 50000—80000 за суткі. За дадатковую паслугу ідзе дармовы сьняданак. Калі апынецеся ў Белавескай пушчы, можаце завітаць у сядзібу Дзеда Мароза. Яна знаходзіцца ў Каменюках, што на Камянеччыне. Сядзіба працуе з 9 да 23 гадзін.

Апроч арганізаваных паездак можна паспрабаваць саматугам знайсьці праз агенцыю ці прыватную абвестку «хацінку ў вёсцы». Цяпер на Нарачы ці Браслаўшчыне маецца шэраг «пансіёнаў», дзе са звычайнай сялянскай хаты робіцца двухпавярховы гатэль. За 4—6 у.а. у суткі на чалавека атрымаеце ложка-месцы ў асобным пакоі. Вядома, непадалёк возера ці рака. Калі пашанцуе — тэлевізар з БТ. Праўда, астатнія камунікацыі на вуліцы.

Прынамсі, па такую экзотыку і едуць замежныя экатурысты. Аднак выбар невялікі: усяго 20 маршрутаў. Столькі прапануе ГА «Агра- і экатурызм». Маршруты канцэнтруюцца збольшага ў Белавежы і на Мядзельшчыне. Пры гэтым у суседняй Літве ёсьць каля 400 прапаноў толькі па сельскім турызьме. Гаспадары беларускіх сядзіб могуць прымаць да 15 чалавек. Сярод паслуг для экатурыстаў ёсьць і паляваньне. У гаспадарках Белавежы ўжо нават маецца свой прайс-ліст для паляўнічых-замежнікаў. Забіты зубр каштуе 3800 даляраў, воўк — 600, алень — 380 «зялёных». Самы танны трафэй — качка. Яна каштуе 10 даляраў.

## «Kill Bill» і хакей на траве

Працягнецца і кінасэзон Менску. Ва ўнітарным прадпрыемстве «Кінавідэапракат» Менгарвыканкаму кажуць, што чакаецца шэраг прэм’ер. Зь беларускіх фільмаў — дакумэнтальны Анатоля Алая «За два крокі ад гільятыны» і мастацкі Пётры Крывастаненкі «Яшчэ раз пра вайну» паводле твораў Віктара Канецкага. З 19 ліпеня чакаецца сусьветная прэм’ера «Забіць Біла-2» Квэнціна Таранціна. З астатняга — «Пасьлязаўтра», «Вечнае зьзяньне страсьці», «Маладыя таткі».


WWW.MOVIEWEB.COM

У самым канцы чэрвеня і 1 ліпеня можаце пасьпець на выставу ў Нацыянальным мастацкім музэі «Жорж Санд. Гравюры», якая ладзіцца сумесна з пасольствам Францыі. З 6 ліпеня там зьявіцца новая экспазыцыя — «Шагал і сцэна» з фонду Шагала. На працягу ўсяго месяца можна паглядзець выставу «Красуй, Беларусь».

Другая палова ліпеня будзе насычана спартыўнымі падзеямі. Так, у Менску 25—31 ліпеня адбудзецца чэмпіянат Эўропы па хакеі на траве сярод юніёраў. Улічваючы нацыянальную любоў да хакею наагул, можна здагадвацца, што ЧЭ пройдзе «на ўра». Ёсьць і яшчэ адно мерапрыемства, куды наўрад ці выйдзе патрапіць, — праводзіны афіцыйнай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на Алімпійскія гульні ў Атэны. На ўсялякі выпадак — цырымонія пройдзе, паводле папярэдніх зьвестак, 24 ліпеня.

**Сяргей Трафілаў**

# Вільня

## і Дзед Мароз улетку


PHOTO BYMEDIA.NET

Каб убачыць сёлета Вільню, прыйдзецца выкласьці менскім турагенцыям ад 20 даляраў за экскурсійны тур. Каля 240 даляраў будзе каштаваць паўнавартасны адпачынак на Балтыцы. Праехацца па «залатым колцы Расеі» ці пагуляць па Пецярбурзе каштуе 120—150 «зялёных». Пры гэтым такая ж экскурсійная паездка ў Кракаў ці Варшаву абыдзецца ў палову таньней.


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Помнік Гедыміну ў Вільні.**



## Малюнкі Быкава

**У галерэі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту (пр.Скарыны, 24) да 16 ліпеня працуе выстава «Васіль Быкаў: маляваны дзёньнік пісьменьніка». Дзёньнікі — іранічныя імгненныя замалёўкі Быкава на прагулках, у дарозе, на працы. Уваход вольны.**

## Толькі неба ды мора

У «Vilnius Gallery» (Каліноўскага, 55) **да 3 верасьня** экспануецца выстава жывапісу Леаніда Леўчанкі «Толькі неба ды мора вакол...».

## Дакумэнтальная фатаграфія

У галерэі візуальных мастацтваў «NOVA» (вул.Харужай, 16) экспануецца выстава дакумэнтальнай фатаграфіі з фондаў Дзяржаўнага архіву кінафотафонадакумэнтаў Беларусі «Хроніка вызваленьня». Выстава працуе **да 23 ліпеня**.

## Заля чаканьня Міхала Баразны

**29 чэрвеня** а 18-й гадзіне у «М-галерэі» Інстытуту Гётэ (Фрунзэ, 5) адбудзецца адкрыцьцё выставы Міхала Баразны «Заля чаканьня». Выстава працуе **да 16 ліпеня**. Уваход вольны. Т.: 236-34-33.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Чэмпіянат па саўне

**Гэтую падзею можна ня толькі паназіраць, у ёй можна ўзяць удзел! 27 чэрвеня ў Вітоўцы (Койданаўскі раён) пройдзе адкрыты чэмпіянат Беларусі па спартовай саўне «Шчодры жар-2004». Чэмпіянат падтрымалі таксама ў Міністэрстве спорту й турызму і асабіста міністар Юры Сівакоў. З ахвотных выпрабаваць сябе ў экстрэмальных умовах адбяруць шэсьць мужчынаў і жанчынаў для ўдзелу ў чэмпіянаце сьвету па спартовай саўне 6—8 жніўня ў Фінляндыі.**

## Канцэрты

**Гітара**

1 ліпеня ў залі камэрнай музыкі адбудзецца канцэрт ляўрэата міжнародных конкурсаў Дзьмітрыя Нілава (клясычная гітара). Пачатак а 19-й гадзіне. Квіткі — 5000.

**Заля камэрнай музыкі**

**25** (пт) — канцэрт арганнай музыкі. Выканаўца Я.Аўраменка (Масква).
**28** (пн) — выступ Менскага струннага квартэту і швэдзкіх выканаўцаў — Бруна Маера (флейта) ды Хана Ёнкерса (гітара).
**5** (пн) — выступае Дзяржаўны камэрны хор Беларусі пад кіраўніцтвам Натальлі Міхайлавай. Квіткі — 3000.
**6** (аўт) — «Непаўторная Гішпанія». Гучыць музыка гішпанскіх кампазытараў, народныя сьпевы. Квіткі — 4000.
**12** (пн) — у цыкле «Шэдэўры вакальнай музыкі» выступае Івона Кавалькоўска (Польшча). Квіткі — 5000.

## тэатры

**Опэра**

**26** (сб) — Канцэрт Натальлі Рудневай, Вікторыі Курбацкай, Алега Мельнікава, Сяргея Франкоўскага. Дырыжор — Вячаслаў Чарнуха.
**8** (чц) — Канцэрт «Вянок папулярных мэлёдый».

**Купалаўскі тэатар**

**25** (пт), **26** (сб) — «Каханьне ў стылі барока».
**27** (ндз) — «Кім».
**28** (пн) — «Смак яблыка».
**30** (ср) — «Чорная панна Нясьвіжу».

**Малая сцэна**

**25** (пт) — «Баляда пра каханьне».
**28** (пн) — «Налу».
**30** (ср) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

**Балет**

**25** (пт), **30** (ср) — «Лебядзінае возера».
**29** (аўт) — «Рамэо і Джульета».

**Беларускія сэзоны**

**28** (пн) — «Ці лёгка падмануць жанчыну».
**29** (аўт) — «Карусэль».
**30** (ср) — «Танга ўтраіх».

**Музычны тэатар**

**28** (пн) — «Цыганскі барон».
**29** (аўт) — «Вальпургіева ноч», «Шапэніяна».
**30** (ср) — «Марыца».

## Клюбнае жыцьцё

**Графіці**

**25** (пт), 20.00 — «ROCKавая пятніца». Група «Белые лица». Уваход толькі па картках клюбу. Т.: 8-029-693-74-16, 280-01-54.

**Bronx**

**24** (чц), 22.00 — клюбны чацьвер: dj Top.
**25** (пт), 22.00 — «Live Jazz»: Atava.
**26** (сб), 22.00 — «Start party on vinyl»: dj Box.
**30** (ср), 22.00 — «Madera Hard Blues».

**Белая Вежа**

**24** (чц), 22.00 — «White Tower party»: dj Grizzly. Квіткі — 5000.
**25** (пт), 22.00 — «Белыя ночы»: dj Ніл (Radio RECORD), dj Талстой (club Jet Set), go-go Madstyle, спэцыяльныя лазэрныя спэцэфэкты. Квіткі — 20000—30000, з флаерам — 15000—25000.
**26** (сб), 22.00 — dj Mixell (europop). Квіткі — 10000—20000.

**X-Ray**

**25** (пт), 22.00 — dj Top.
**26** (сб), 22.00 — dj Bergamo.

**Ямайка**

**25** (пт), 21.00 — «The Preparty + The Afterparty».
**26** (сб), 3.00 — «The Afterparty».

**Гудвін**

**25** (пт) — Дзень выпускніка.
**26** (сб), 21.00 — жывая музыка.

## Кінатэатры

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Ван Хельсынг»***: **25** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 13.30, 16.00, 18.30, 21.00.
«Пітэр Пэн»: **25** (пт) 14.00, 16.10, 18.20; **26, 27** (сб, ндз) 11.50, 14.00, 16.10, 18.20.
«Коньнік па імені Сьмерць»: **25—27** (пт—ндз) 20.30.

**«Бярэсьце»** (272-87-91)
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **25** (пт) 15.00, 18.00, 20.50; **26, 27** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.40, 18.20, 20.50.

**«Дружба»** (240-90-13)
«50 першых пацалункаў»: **25, 27** (пт, ндз) 17.00 (іл), 19.00, 21.00; **26** (сб) 17.00, 19.00, 21.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Ван Хельсынг»***: **25** (пт) 15.40, 18.20, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 15.40 (іл), 18.20, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Ван Хельсынг»***: **25** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 13.30 (іл) 16.00, 18.30, 21.00.

**«Мір»** (288-22-33)
«Троя»: **25** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.
«Брудныя танцы-2»***: **25—27** (пт—ндз) 21.20

**«Перамога»** (223-77-66)
«Жменя травы» (фэстываль некамэрцыйных фільмаў «Дні кіно пра ўцекачоў): **25** (пт) 19.00.
«Зімовая гарачыня» (прэм'ера): **26, 27** (сб, ндз) 19.00.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **25** (пт) 13.50, 16.20; **26, 27** (сб, ндз) 13.50 (іл), 16.20.
«Барвовыя рэкі-2»****: **25—27** (пт—ндз) 21.00.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Іншы бок пасьцелі»***: **25—27** (пт—ндз) 19.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Троя» **25** (пт) 17.00, 20.00; **26, 27** (сб, ндз) 14.00, 17.00, 20.00.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **25** (пт) 11.00, 14.00; **26, 27** (сб, ндз) 11.00 (іл).

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Для дзетак

**Купалаўскі тэатар**

**27** (ндз) — «Афрыка».

**кіно**

**«Аўрора»**
«Блізард»: **25** (пт) 10.30.
**«Бярэсьце»**
«Карлік Нос»: **25** (пт) 10.30; **26, 27** (сб, ндз) 11.30.
**«Дружба»**
«Залатыя рогі»: **25** (пт) 10.30.
«Дыназаўр»: **25, 27** (пт, ндз) 13.00.
«Спартак і Калашнікаў»: **26** (сб) 13.00.
**«Мір»**
«Скарб»: **25** (пт) 10.30.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **26, 27** (сб, ндз) 13.00.
**«Піянер»**
«Цімур і ягоныя камандас»: **25** (пт) 10.20, 17.00; **26, 27** (сб, ндз) 14.20.
«Гуляй як Бэкхем»: **25** (пт) 12.20; **26, 27** (сб, ндз) 12.20, 17.00.
«Кніга джунгляў-2»: **25** (пт) 14.20; **26, 27** (сб, ндз) 10.30.

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

# Добры вампір — маўклівы вампір



WWW.MOVIEWEB.COM

«Ван Хельсынг» («Van Helsing»)
ЗША—Чэхія, 2004, каляровы і ч/б, 132 мін.
**Жанр:** Комікс жахаў.
**Адзнака:** 5 (з 10).

Галівуд здаўна прыглядаўся да коміксаў, але комікс «Ван Хельсынг» — гэта не экранізацыя чарговых папяровых карцінак. Гэта кіно, пераўтваранае ў карцінкі — дынамічныя, пуставатыя, з нагрувашчанымі эфэктамі. А сыравінаю паслужылі клясычныя пачвары з кінаархіваў студыі «Universal». Адпаведна жанру, у коміксе дзейнічаюць двухаблічны звышнягоднік і супэргерой, схільны пераўтварацца ў кажана, павука ці якую іншую істоту (Ван Хельсынгу ў гэтым сэнсе не пашанцавала зь пярэваратнямі).

А ворагам супэргероя Ван Хельсынга выступае дзеталюбны граф Дракула (Рычард Роксбэрг), які з дапамогаю Франкенштэйна — і тэхнікі XIX ст. — марыць ажывіць сваіх крылатых сысункоў, што высьпяваюць у коканах (згадваецца «Чужы»), зьнесеных нявестамі графа.

Звычайна галоўнага паляўнічага на вампіраў уяўлялі сталым прафэсарам з калом у руках. Згодна з задумай сцэнарыста й рэжысэра Стывэна Сомэрса, які праславіўся «Муміяй», Ван Хельсынг (Х'ю Джэкман) не такі. Гэта малады чалавек у сучасным і крыху каўбоістым прыкідзе, патаемны агент Ватыкану, узброены паводле апошняга слова вайскова-царкоўнай тэхнікі.

Малады ўзрост дазваляе Ван Хельсынгу закруціць раман з цыганскай прынцэсай, абараняць якую ён закліканы. Але дзяўчыну (Кейт Бэкінсэйл, якая ўжо навампірылася ў «Другім сьвеце») чакае лёс усіх нявест Джэймса Бонда. Адмысловыя эфэкты і бойкі — паветраны дэсант вампірэс, ліквідацыя доктара Джэкіла (у якасьці разьмінкі), сьлізкія коканы пад токам, зьдзіраньне ваўкалакам зь сябе чалавечай скуры — гэта і форма, і зьмест сур'ёзнага высокабюджэтнага фільму.

Часам героі вымушаны разяўляць рот — і ня толькі для таго, каб пакусаць каго-небудзь, але й каб выказацца. Лепей бы яны гэтага не рабілі. У кампутарызаваным фільме зьнікае аўра. Толькі зрэдку — у чорна-белым пачатку пад «Франкенштэйна» ці напрыканцы сцэны баляваньня — зьяўляецца нешта сапраўднае.

Новы імідж Ван Хельсынга надзвычай пэрспэктыўны, але прыгоды ягоныя не даведзены да кінастылёвага ладу. Мо варта дачакацца, калі ў Стывэна Сомэрса адродзіцца пачуцьце гумару?

**Андрэй Расінскі**

# Трыё бандурыстаў і хлопцы ў шараварах

Міхась Скобла

Ёсьць сьвяты, якія сьвяткуюцца па традыцыі, а ёсьць сьвяты, якія адзначаюцца па інэрцыі. Да ліку апошніх у Беларусі адносіцца Дзень беларускага пісьменства й друку. Зьявіўся ён на пачатку 90-х і быў зусім нялішнім у беларускім сьвяточным календары. Ну хіба кепска, калі ў Наваградак, Полацак альбо забыты Богам Тураў (а сьвята ад пачатку задумвалася як вандроўнае) прыяжджаюць пісьменьнікі, выдаўцы, кнігагандляры й прывозяць людзям Кнігу? Ці — калі высокі сталічны начальнік добрым словам згадае Францішка Скарыну й, хай сабе па паперцы, запінаючыся, абвесьціць на шматлюдным пляцы, што й яго, аказваецца, «Бог з таго языка на сьвет пусьціў». Адбудзецца сьвята й сёлета, такой бяды, што з усёй пісьменьніцкай грамады на яго будуць дапушчаны адзін гімнатворац і пісьменьніца несьмяротнай бэнкендорфавай пароды, што самахоць ды зь неабыякім стараньнем узялася выконваць ролю цэнзара.

Думалася, што падобнае магчыма толькі ў нашай незвычайнай краіне. Аказалася — не, у братоў-украінцаў таксама існуе сьвята, якое адзначаецца хутчэй па інэрцыі, чым па традыцыі. І называецца яно Міжнародным шаўчэнкаўскім сьвятам «У сям'і вольнай, новай…», уражаньнямі пра якое я й хачу падзяліцца з чытачамі «НН».

Прыяжджаем у Кіеў. У тамтэйшым Саюзе пісьменьнікаў адключаныя тэлефоны (знаёмая карціна, у нас іх адключаюць пэрыядычна). З размовы з украінскімі калегамі даведваемся, што прыезд некалькіх замежных дэлегацый стаўся магчымым толькі дзякуючы дэпутатам Вярхоўнай Рады з фракцыі «Наша Ўкраіна», якія сабралі грошы, бо рахунак пісьменьніцкай арганізацыі арыштаваны. Гасьцям выдаюць запрашальнікі на ўрачысты канцэрт у філярмоніі. Слухаем: народны хор, трыё бандурыстаў, сола опэрных сьпевакоў, сьпявачак і намесьніка мэра, вершы Кабзара ў выкананьні народнага артыста; глядзім: этнаграфічную кампазыцыю, харэаграфічную пастаноўку, галавакружныя скокі хлопцаў у шараварах, якія сваім імпэтам не саступаюць «дзікім танцам» на Эўрабачаньні. Пісьменьнікаў не чуваць.

Пасьля канцэрту наведваемся на выставу «Кніжны сад», якая адбываецца поруч у трохпавярховым спэцыялізаваным будынку. Знаходжу й купляю сьвежы нумар часопісу «Вежа» зь перакладамі апавяданьняў Барыса Пятровіча. У вочы кідаецца знаёмы вусаты партрэт, пад якім ляжаць зь дзясятак падручнікаў, кніга «Пра герб і сьцяг» і некалькі фотаальбомаў. Падкручваю вусы й з выглядам выпадковага мінака з Хрушчацік тыцкаю пальцам у партрэт: «Цэ шчо, білоруській письмэнных?» У адказ выслухоўваю агітпропаўскую лекцыю пра мудрую палітыку беларускага прэзыдэнта, прамоўленую без асаблівага імпэту.

Назаўтра едзем у Белую Царкву, дзе маюць адбыцца асноўныя мерапрыемствы. У вялізным гмаху дому культуры нас ужо чакае чарговы канцэрт: народны хор, трыё бандурыстаў, хлопцы ў шараварах… Катаваньне народным мастацтвам (гэтым разам — трохгадзіннае) працягваецца. Пісьменьнікаў і тут не чуваць, адчуваецца, што ўлады іх папросту баяцца. Сёй-той зь іх ужо напытвае транспарт да Кіева. Беларусам падзецца няма куды — хаўрусуемся з кіяўлянамі й шчыльнымі радамі ідзём на гарадзкі пляц мітынгаваць. А туды ўжо нагналі дзьве-тры сотні казакаў у шыроkалямпасных штанах. Казакі зусім не выглядаюць на спадкаемцаў Запароскай Сечы: у кожнага на рукаве шаўроны «Украинское казачество» і перамаўляюцца яны па-расейску. Казацкае карэ бярэ ў аблогу і помнік Шаўчэнку, і нас, купку літаратараў. Пры гэткай слухацкай аўдыторыі можна пагуляць у дэмакратыю: да мікрафона запрашаюцца пісьменьнікі.

Старшыня Саюзу пісьменьнікаў Беларусі Алесь Пашкевіч паказвае грамадзе дбайна выдадзеную кнігу «Шаўчэнка й Беларусь». Пісьменьнік з Львова закранае палітычную сытуацыю на Ўкраіне. «Езжай к своим бендеровцам и там митингуй!» — цэдзіць праз зубы найбліжэйшы да мяне атаман, грудзі якога нагадваюць іканастас. Пышнавусы Кабзар на працягу ўсяго дзейства ля свайго падножжа паглядае з-пад ілба, і цяжка зразумець — радуе ці прыгнятае яго такое сумоўе «ў сям'і вольнай, новай».

На разьвітальнай вячэры нас чакаў яшчэ адзін канцэрт, гэтым разам без бандурыстаў і шараварау. Выйшлі хлопцы з электрагітарамі ды разанулі хіт з рэпэртуару Веркі Сярдзючкі: «Ще не вмерла Украина, если мы гуляем так!..» У адказ нечакана для сябе пачулі дружнае «геть зі сцены!» й хуценька паўцякалі, каб праз паўгадзіны вярнуцца й, як ні ў чым не бывала, заграць «Червону руту».

Па вяртаньні ў Кіеў уздыхаем з палёгкай. Сябры арганізоўваюць прэзэнтацыю часопісу «Дзеяслоў» у Кіева-Магілянскай акадэміі. Людзей прыходзіць няшмат, але не відаць абыякавых. Сустрэчу вядзе Алеся Мамчыч — 23-гадовая перакладчыца нашай паэзіі, якая дзеля беларусаў адклала падрыхтоўку да ўласнага вясельля. Вечарам нас выганяе з кавярні расейская папса, і паэт Раман Скіба вядзе ўсіх на майдан, дзе ля помніка філёзафу Скавадрэ, якога сьвет лавіў, але не схапіў, моладзь да поўначы чытае вершы й сьпявае песьні. Даведаўшыся, што на майдане прысутнічаюць госьці зь Беларусі, разгарачаныя «чарнігаўскім» музыкі раптам без рэпэтыцыі натхнёна выконваюць «НРМ»аўскую кампазыцыю «Сонца нам дапаможа». Адкуль такія пазнаньні? З кніжак, з Інтэрнэту. Увогуле, зацікаўленасьць украінцаў Беларусяй зьдзіўляе.

> «Езжай к своим бендеровцам и там митингуй!» — цэдзіць праз зубы найбліжэйшы да мяне атаман, грудзі якога нагадваюць іканастас.

Цяпер колькі словаў для падагульненьня. Сытуацыя ва Ўкраіне непараўнальная зь беларускай, але аналёгіі пачынаюць напрошвацца. Стаўленьне афіцыйных уладаў да нацыянальнай культуры ў Менску й Кіеве падобнае. Расейская папса гаспадарыць у беларускім і патроху завяёўвае ўкраінскі радыёэтэр. Украінскія кнігавыдаўцы ніяк ня могуць ачомацца ад увядзеньня 20-адсоткавага ПДВ (беларускіх ён ужо амаль даканаў). Украінскі прэм'ер Януковіч у выпадку абраньня яго прэзыдэнтам на восеньскіх выбарах можа пайсьці беларускім шляхам.



WWW.BITBURG.DE

Катаваньне народным мастацтвам цягнулася тры гадзіны.

IN MEMORIAM

# Чалавек Культуры

Упершыню я сустрэўся зь Віктарам Шавялевічам у 1997 г. у Беларускім відэацэнтры, куды я прынёс свой сцэнар эксьпэрымэнтальнай стужкі. Гэта быў мой дэбют. Шавялевіч, як кіраўнік відэацэнтру, рызыкаваў, але толькі сёньня я разумею, наколькі ён рызыкаваў.

Памятаю, як фільм глядзеў высокі чыноўнік і спрабаваў знайсьці небясьпечныя намёкі ў цытатах з Гоі — а Шавялевіч акуратна адхіляў магчымыя абвінавачаньні. «Мы займаемся культурай», — казаў ён пра працу. А культура была, ёсьць, будзе.

І ёсьць культура Асобы, людзі, якія сваім жыцьцём спакойна і ціха сьцьвярджаюць культуру. Віктар Шавялевіч быў такім.

Ён зрабіў болей за 70 фільмаў, сярод іх і гістарычны тэлефільм-прыпавесьць «Пастка для зубра».

Ніхто ня ўмее так адчуваць фактуру спэктаклю ці жывы й нястрыманы рытм балету, каб увасобіць іх на стужцы. Яшчэ ў 1987 г. Шавялевіч зьдзейсьніў тэлевізійную экранізацыю беларускага балету — цыкл «Стварэньне». Перанёс на плёнку твор іншага мастацтва — а перакладчыкі ведаюць, наколькі гэта складана, — з такой ашчаднасьцю й адначасова з такой творчасьцю, каб каштоўныя імгненьні культуры маглі захавацца ў вечнасьці.



АЛЯКСЕЙ МАЦЮШ

Віктар Шавялевіч (зьлева) зрабіў болей за 70 фільмаў, сярод іх і гістарычны тэлефільм-прыпавесьць «Пастка для зубра».

Захаваць культуру, захаваць гісторыю, захаваць асяродзьдзе, захаваць тое, што робіць чалавека чалавекам, — гэта і рабіў Віктар Шавялевіч, ці то сваёй хронікай сівой беларускай мінуўшчыны, ці то клопатам пра экалягічны фэстываль.

Што прымушала яго абсалютна бескарысьліва дапамагаць маладым рэжысэрам, абараняць іх ад нападак, падтрымліваць, тлумачыць прыёмы прафэсіі й творчыя вынаходкі? Клопат пра культурную пераемнасьць і духоўнае сьвятло.

Чалавек духоўнасьці й сумленьня, някідкага, але дзейснага сьвятла й дабрыні — ён як заклікаў фільмам «Ствараць дабро», так і рабіў. Ягоная штодзённая карпатлівая праца была і ёсьць захаваньнем і адбудовай таго падмурку, на якім заўжды існуе чалавечая культура — учора, сёньня, заўтра. Гэта тое, без чаго мы проста зьдзічэлі б.

Калі чалавеку надыходзіць час, кажуць «ён сышоў». Віктар Шавялевіч не сышоў. Ён застаецца з намі.

**Андрэй Расінскі**

## Стагодзьдзе «Ўлісу»

16 чэрвеня 1904 г. — самы вядомы «літаратурны» дзень: ён апісаны ў рамане Джэймса Джойса «Ўліс». Сёлета 16 чэрвеня адбыліся сьвяткаваньні, прысьвечаныя 100-годзьдзю Блумсдэю (у гонар героя рамана Леапольда Блума). 13 чэрвеня ў Дубліне адбыўся «Блумсдэй-сьняданак», аналягічны апісанаму ў рамане. У ім удзельнічалі каля 10 тыс. чалавек, бальшыня якіх была апранута па модзе 100-гадовай даўнасьці.

## Куры Тарасэвіча

Вядомы беластоцкі мастак Лявон Тарасэвіч наладзіў у варшаўскім парку Лазенкі выставу японскіх дэкаратыўных курэй, якіх ён сам гадуе. Тарасэвіч — старшыня Кола дэкаратыўных птушкаводаў «Gallus».

## Менск. Памяць-3

Выйшла 3-я кніга з сэрыі «Памяць», прысьвечаная Менску. Яна апісвае 1921—1940 г. Апроч зьвестак пра НЭП і першыя пяцігодкі, кніга месьціць сьпіс рэпрэсаваных менчукоў.

## «М» — гэта музэй

У Варшаве адбылася «Ноч музэяў»: 19 чэрвеня кожны ахвотны мог зь вечара да поўначы бясплатна наведаць 11 найбуйнейшых музэяў і галерэй гораду («Замак», Паватовы цэнтар сучаснага мастацтва, «Крулікарню», Музэй Шапэна, Гістарычны музэй, музэй карыкатуры, літаратуры, тэхнікі й Зямлі, а таксама Каралеўскі замак). Каб наведнікам было зручней, між музэямі езьдзілі аўтобусы, пазначаныя літарай «М».

**АВ; Gazeta.pl, Gazeta.ru**

# Чым даражэйшае кіно,

## тым менш свабоды



АЛЯКСАНДАР КАЛЯСКОЎ

**Добрае кіно — сьвята для кінаманаў. З 5 да 8 чэрвеня Беларусь наведаў Ян Труэль, сусьветна вядомы кінарэжысэр, апэратар і сцэнарыст. 73-гадовы швэдзкі клясык прэзэнтаваў беларускай аўдыторыі свае карціны, паўдзельнічаў у тэлепраграме «Час кіно», наведаў цырк і Музэй вялікай айчыннай, адказаў на пытаньні на прэс-канфэрэнцыі і сустрэўся са студэнтамі Акадэміі мастацтваў. Падаём увазе чытачоў гутарку зь Янам Труэлем.**

**— Як Вы трапілі ў такую сур'ёзную індустрыю, як кіно? Спачатку ж Вы займаліся аматарскімі здымкамі?**

— Мне, мабыць, пашанцавала. Калі я пачаў рабіць свае першыя кароткамэтражныя фільмы, то ў іх якраз была патрэба на швэдзкай тэлевізіі. Тэлевізія іх хацела паказваць, прычым новыя фільмы яшчэ невядомых рэжысэраў. Я атрымаў замову ад тэлевізіі гораду Мальмэ, каб зрабіць сумесны кароткамэтражны фільм зь пісьменьнікам Бу Відэрбэргам. У 1961 г. мы зрабілі зь ім карціну. Відэрбэрг напісаў сцэнар і быў рэжысэрам. Я таксама займаўся рэжысурай і мантажом. Вынік нам спадабаўся, і Бу Відэрбэрг вырашыў стаць рэжысэрам. У ягоным поўнамэтражным фільме «Дзіцячы вагон» я быў апэратарам.

**— Вас разам з Бу Відэрбэргам, Вільготам Шоманам называюць лідэрам «новага швэдзкага кіно», якое выступала супраць замкнёнага псыхалягічнага кіно Бэргмана. Што гэта было за супрацьстаяньне?**

— Гэта перш-наперш Бу Відэрбэрг — пад уплывам «францускай новай хвалі» і так званага ангельскага «пасудамыйнага рэалізму» ён надрукаваў тры артыкулы ў швэдзкіх газэтах. Ён крытыкаваў Бэргмана й казаў, што мы мусім больш наблізіцца да рэальнасьці. Вільгота Шомана нельга назваць апазыцыянэрам Бэргману, ён хутчэй ягоны вучань. Для мяне Бэргман таксама вельмі шмат значыць. Бэргман абудзіў ува мне цікавасьць да псыхалёгіі, да пачуцьцяў людзей. З другога боку, было шмат маладых рэжысэраў, якія ішлі за Відэрбэргам, яны раней працавалі тэатральнымі рэжысэрамі, пісьменьнікамі. А я быў апэратарам. Але, як і Бу Відэрбэрг, я пакідаю павільёны і здымаю на адкрытым паветры.

**— «Новае швэдзкае кіно» 60-х лічыцца бунтарскім. А Вы бунтар па прыродзе?**

— Я не зьяўляюся бунтаром па прыродзе. Гэта ня значыць, што я ня маю крытычных поглядаў на рэчаіснасьць, але не, я не бунтар.

**— А цікавіцеся палітыкай?**

— Я ня маю вялікай зацікаўленасьці палітыкай. Але як грамадзянін я, зразумела, бяру на сябе адказнасьць і ўдзельнічаю ў палітычным жыцьці краіны.

**— Чаму глыбінны, экзыстэнцыйны псыхалягізм уласьцівы кіно Швэцыі, дзе ўсё спакойна, стабільна?**

— Сапраўды, гэта так. У Швэцыі ёсьць даўняя традыцыя псыхалягізму, яна паўплывала й на мяне. Наша кіно заўжды грунтавалася на паказе ўнутранага сьвету чалавека. Магчыма, менавіта гэта зьяўляецца візытоўкай швэдзкіх кінэматаграфістаў. Хаця ў апошнія гады фільмы сталі больш павярхоўныя, больш зьявілася баевікоў, павярхоўных камэдый.

**— Ёсьць пэўныя стэрэатыпы пра швэдзкае кіно. Яно стварае ўражаньне паўночнага, суровага, аскетычнага. А ці магчымы яго сынтэз, скажам, з традыцыяй паўднёвага карнавалу?**

— Што да стэрэатыпаў, свой уплыў тут зрабілі фільмы Інгмара Бэргмана, якія паказваў швэдаў такімі. Мо ёсьць што і ў сапраўднасьці? А наконт скрыжаваньня швэдзкага кіно з паўднёвым… Бэргману прапаноўвалі зьняць сумесную стужку з Фэліні. Спачатку і Бэргман, і Фэліні пагадзіліся, але потым адмянілі сваё рашэньне і да здымак так і не дайшло. Наконт асаблівасьцяў — магчыма, геаграфічныя прычыны тут ёсьць. Швэцыя — нягустанаселеная краіна на вялікай плошчы — гэта накладае свой адбітак і знаходзіць адлюстраваньне ў кіно.

**— Вы адзін з швэдзкіх рэжысэраў, якіх запрасілі ў Галівуд. Чаму так адбылося і наколькі Вам спадабалася там працаваць?**

— Прычынай, чаму мяне запрасілі ў Галівуд, былі дзьве эпічныя карціны — «Эмігранты» і «Пасяленцы». Таксама ў карцінах здымаліся Ліў Ульман і Макс фон Сюдаў, якія ўжо былі вядомы ў Амэрыцы зь фільмаў Бэргмана. Джын Хекман прапаноўваў Ліў Ульман розныя рукапісы, сцэнары — і запрасілі мяне… Гэта была карціна «Нявеста Зандзі».

Кожнай справай у Галівудзе занята значна больш чалавек, чым у нас у Швэцыі. Я раней сам быў апэратарам сваіх карцін. У Галівудзе мне гэтага не дазволілі, бо там існуюць жорсткія прафсаюзныя правілы.

**— Дык у Галівудзе адбываецца падаўленьне аўтарскага пачатку?**

— Я не лічу, што сам Галівуд падаўляе асабісты пачатак. Гэтае падаўленьне адбываецца праз кошт карціны: чым даражэйшая вытворчасьць, тым менш свабоды, тым большы ціск. Я зрабіў у Галівудзе дзьве карціны, і паміж імі я адчуваў вялікую розьніцу. Другая карціна «Ўраган» (ішла ў савецкім пракаце. — **Аўт.**) была даражэйшая, і там я адчуваў сябе менш свабодным. Мне прапанавалі зьняць 10 карцін, але я вярнуўся ў Швэцыю.

**— А як ажыцьцяўляецца фінансаваньне швэдзкага кіно?**

— Сёньня, каб зрабіць фільм, трэба атрымаць грошы зь некалькіх крыніц. Гэта могуць быць розныя фонды, міжнародныя і швэдзкія. Адна кампанія ня ў стане прафінансаваць цэлую карціну. Звычайна грошы ўкладаюць адразу пяць-шэсьць, а то і сем-восем арганізацый.

**— А Швэдзкі кінаінстытут?**

— Безумоўна, ён застаецца самай галоўнай крыніцай, але цяпер карціны фінансуюць некалькі фондаў. На існаваньне Швэдзкага кінаінстытуту ідзе 10% ад пракату ўсіх фільмаў. Дарэчы, 25% пракату складаюць швэдзкія фільмы. Гэта вельмі добры паказьнік.

**— Наколькі для Вас важная мова фільму?**

— Я лічыў, што швэдзкае кіно можна зьняць толькі на швэдзкай мове. Але я рабіў карціну «Эль капітана», дзе галоўныя героі фіны. Я запрасіў маладых фінскіх актораў, юнака і дзяўчыну, недасьведчаных у кіно. Мы папрасілі іх сыграць адну сцэну. У мяне, хаця я нічога не разумеў, з таго, што яны гаварылі, было адчуваньне сапраўднасьці, непасрэднасьці. Гэтае адчуваньне прайшло праз усю карціну. Мы спачатку пісалі дыялёгі на швэдзкай мове, потым яны перакладаліся, але я прасіў актораў зьмяняць фразы пад сябе, каб гучала лепей з пункту гледжаньня іхняга пакаленьня, іхніх катэгорый. Так што, калі мы здымалі фільм, я не разумеў абсалютна ні слова, але я ведаў, што яны іграюць па-сапраўднаму. Цяпер я лічу, што ёсьць нешта, акрамя мовы, што можа перадаваць пачуцьці, сапраўднае жыцьцё. Таму я быў вымушаны адмовіцца ад свайго ранейшага перакананьня, што мова адыгрывае галоўную ролю ў кіно.

**— Скажыце, а ці ёсьць магчымасьць у беларускіх студэнтаў рэжысэрскага факультэту трапіць да Вас на стажыроўку?**

— Я атрымліваю шмат лістоў ад маладых людзей, якія жадаюць паўдзельнічаць у здымках, часьцяком без аплаты. Я ў свой час, прызнаюся вам, сам зьвяртаўся з падобнымі просьбамі — і часам гэта атрымлівалася.

**— Ці ёсьць у Швэцыі кінацэнзура?**

— Цэнзура праяўляла сябе ў 70-я гады. Былі праблемы ў Вільгота Шомана празь фільм «Я цікаўлюся: жоўты»: жоўты — гэта адзін з колераў нацыянальнага сьцягу. У Бэргмана былі праблемы з цэнзарамі. Спрабавалі рабіць нейкія выразкі, гэта тычылася й замежных фільмаў. Тэмы, якія былі забаронены, — гэта грубы гвалт і грубыя сэксуальныя сцэны. Сёньня цэнзура выконвае ролю клясыфікатара — які фільм для якога ўзросту.

**— Якое неба Вам найбольш падабаецца?**

— Неба зранку і позна ўвечары.

**Занатаваў Андрэй Расінскі**



**«Гэта тваё жыцьцё»** («Här har du ditt liv») Швэцыя, 1966, ч/б і каляровы, 130 хв. (бязь некалькіх частак)
**Жанр:** Гістарычная драма
**Адзнака:** 9,5 (з 10)

Першы поўнамэтражны шэдэўр Яна Труэля, у якім аўтар выступіў і рэжысэрам, і апэратарам, і мантажнікам. Эпічная драма ляўрэата Нобэлеўскай прэміі Эйвінда Юнсана падаецца высокаю кінэматаграфічнаю мовай. Побытавае «нэарэалістычнае» жыцьцё акунаецца ў ашаламляльныя каляровыя трызненьні, а наіўныя карцінкі нямога кіно пазначаюць сталеньне душы героя. Ян Труэль, які пачынаў у кіно фатографам і апэратарам, зь неймавернай згрябнасьцю ажыцьцяўляе пераход ад рэчыўнай, важкай штодзённасьці да чырвонай тканіны ўнутраных станаў і імгненнай фатаграфіі пачуцьцяў.

Нясьпешная, нетаропкая, дакладная ў дэталях гісторыя юнака, які на пачатку XX ст. далучаецца да сацыялістаў, раскрывае нам швэдзкую душу, сацыяльныя абставіны й прыроду, сны й сьвядомасьць. Нечакана паўночны фільм нагадае эпас Якуба Коласа — і карціна швэдзкага аўтара адкрые нам і самых сябе.

Хаця ў варыянце, паказаным у нашай краіне, не захавалася некалькі частак, гэта не перашкаджае адчуць асалоду ад рэдкага кіно.

**АР**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Галадуй не галадуй

Махатма Гандзі, дысыдэнт Марчанка, Бобі Сэндс, Эміліна Панкхруст... Цяпер клюб славутых палітгаладоўшчыкаў папоўніся беларускімі «рэспубліканцамі».

Гістарычны факт: тэрарысты «Нямецкага Чырвонага войска» (RAF), ідучы «на дзела», бралі з сабой фотку Вольфганга Рамса — рафаўскага баевіка, які памёр у насьледак палітычнай галадоўкі. Выява жмурыка павінна была ўводзіць левакоў у транс нянавісьці да «грамадзтва сьвіньняў» (сучасны капіталізм у тэрміналёгіі тэрарыстаў). Ня думаю, што ў РБ, дзе большасьць — антылукашысты, шмат хто паставіў у трумо партрэты дэпутатаў «Рэспублікі». Палітычная галадоўка як эфэктная зброя фурычыць выключна пры ўмове шалёнай мэдыя-кампаніі або наяўнасьці грамадзянскай супольнасьці — прадукту асаблівай фазы разьвіцьця грамадзтва. Грамадзтва, якое лічыць найвышэйшай каштоўнасьцю асобу і, натуральна, яе жыцьцё. Уявіце, што халопы графа Прушынскага прыблізна ў XV ст. абвесьцілі палітгаладоўку, патрабуючы ад Сойму ВКЛ выбараў сельскіх войтаў пад кантролем міжнародных інспэктараў зь Сьвятарнай Рымскай імпэрыі. Мяркую, справа не дайшла б нават да вынасу пытаньня на разгляд сэсіі.

Адзіная пэрспэктыва ў аўтарытарных дзяржавах праводзіць страйк — выкарыстоўваць чыноўнічы комплекс «я чалавек маленькі». Ніводны мэн на месяцах не жадае быць крайнім, калі размова ідзе пра жыцьцё і сьмерць. Як камэндант мардоўскіх лягероў, дзе ў 1974-м дысыдэнты адмовіліся жэрці баланду, гэтак і начальнік Акрэсьціна ня хоча мець гемарою за тое, што ягоны кліент адкінуў канькі, ды яшчэ ў насьледак палітгаладоўкі. У наступны раз раю Фралову праводзіць акцыю на дачы ў Канаплёва.

Ахвяраваць дэпутацкім пайком у імя палітычных прыбамбасаў у краіне, дзе палова насельніцтва платняком сядзіць на «Ралтоне», — таксама трошкі дзіўна. Аб гэтым сьведчыць фальклёр, прысьвечаны галадоўцы доктара Гайдэра. У часы Рэйгана амэрыканскі айбаліт, патрабуючы міру ва ўсім сьвеце, пратрымаўся 180 дзён (!). Тым часам у былым СССР, дзе пра яго мукі пісалі штодня, гуляў анэкдот: «Доктар Гайдэр, з вамі галадае ўся Адэса».

У нашых кандышанах палітгаладоўка можа мець рэзананс толькі ў сэктары апазіцыі. Гэтак і выйшла: з генэралам сынхронна галадалі выключна адэпты апазыцыйных партый. Хаця расейская СМІ нешта даносілі да вушэй суайчыньнікаў, замест дэлегацый працоўных калектываў галадоўшчыкаў наведвалі амбасадары і журналюгі. Якраз у гэтым сэктары і адбылася піяр-рэвалюцыя: хедлайнэрамі апазыцыі замест «Пяцёркі» стаў Фралоў і К.

Але ня ўсё так дрэнна. Напярэдзе прапагандысцкая кампанія, калі «Пастскрыптумы», прыгадваючы Фралова ягоныя чэрвеньскія выбрыкі, будуць ізгаляцца па поўнай — заявяць, што ён лятэнтны фанат Поля Брэга (аўтар канцэпцыі здаровай галадоўкі), хіндуіст (яны таксама супраць ежы) або ўвогуле фанат Кафкі. У ягонай навэле «Мастацтва галадоўкі» чувак адмаўляецца есьці, таму што не знайшоў адэкватнай яго густу ежы.

Папрыкалваемся.

**Лёлік Ушкін**

КАІСА

# Чорна-белы плюралізм

Незважаючы на скандалы вакол чэмпіянатаў сьвету, зьвязаныя з амбіцыямі функцыянэраў міжнароднай шахматнай фэдэрацыі, клясычныя шахматы на 64 клетках пакуль яшчэ займаюць вяршыню п'едэсталу сярод інтэлектуальных гульняў — што ў сьвеце, што ў нашым краі. Некаторы час альтэрнатыву ім складалі «польскія», або гексагальныя шахматы. Беларус Сяргей Карчыцкі нават стаў чэмпіёнам Эўропы па гексашахматах, журналісты казалі пра пляны пераўтварэньня апошніх у «беларускую нацыянальную гульню»... Аднак уздым іх папулярнасьці ў канцы мінулага стагодзьдзя скончыўся неўзабаве пасьля арышту небезьвядомага Валера Буяка — галоўнага прапагандыста гульні і будаўніка фінансавых пірамідаў па сумяшчальніцтве. Суполка гексашахматыстаў распалася, каб сабрацца пад новым дахам. Многія зь іх цяперака захапляюцца *сёгамі*.

Калі ў старога, што днямі праседжвае са сваім сябрам за дошкай у менскім парку Чалюскінцаў, запытацца, што ён ведае пра японскія шахматы *сёгі* ці кітайскія *сянцы*, адказам будзе, у лепшым выпадку, пацісканьне плячыма. Ня дужа вітаюць «альтэрнатыўшчыкаў» (ці мо лепей назваць іх прыхільнікамі паралельных шахматаў?) прэса ды спартовыя ўлады. Людзей, якія ўмеюць гуляць у сёгі ды сянцы, у нас вобмаль, аднак гульні гэтыя пэрспэктыўныя. Сёгі лічацца адной з найбольш грашовых забавак сьвету: за ўдзелы ў турнірах эліце плацяць мільёны. У сярэдзіне чэрвеня ў Менску завяршыўся першы чэмпіянат краіны па японскіх шахматах, пераможца якога разьлічвае да дапамогу амбасады Японіі дзеля далейшага кшталтаваньня свайго майстэрства. Летась адкрыўся сайт «Сёгі ў Беларусі», фігуркі з іерогліфамі дэманструюцца з тэлеэкранаў дзякуючы каналу «Лад»…

Японія ды Кітай ад Беларусі далёка, але ж сапраўдны *homo ludens* хоць у Антарктыду паедзе, каб знайсьці годнага партнэра. Праўда, і ў Эўропе ёсьць не абы-якія спэцыялісты па сёгі — кажуць, што гульня гэтая надзвычай арыгінальная й дынамічная, зь нечаканыміператварэньнямі фігур. Урэшце, разнастайнасьць шахматам ня шкодзіла ніколі: як той казаў, хіба важна, якога колеру котка, галоўнае, каб мышэй лавіла.

**ВР**

## Як бы вы згулялі?



**Пазыцыя з кніжкі С.Давыдзюка і Л. Мартынюк «Нанесьці ўдар у дэбюце» (Берасьце, 2004). Ход белых.**

**Адказ на задачу з «НН» №23: 1...Ch3! з моцнай атакай (калі 2. gh, то 2...g2+ 3. Kpg2 Фg5+ 28. Kph1 Kg3+ 29. Kph2 Kge2 30. Tg1 Фg3+! 31. Tg3 fg+ 32. Kph1 g2+! 33. Kph2 Ch6!)**

**3** **ліпеня**

**запрашаем у вандроўку**

**Бялынічы — Караткевіцкае Падняпроўе**

Бялынічы: радзіма мастака Бялыніцкага-Бірулі.

Быхаў: будынкі замку Сапегаў, царква з абразам Маці Божай Баркалабаўскай, сынагога XVII ст., рэшткі старога мосту цераз Дняпро.

Баркалабава: месца зьяўленьня знакамітага летапісу.

Салтанаўка: помнікі ў памяць баёў 1812 г.

Буйнічы: мэмарыял у гонар абароны Магілёва (капліца, вайсковая тэхніка, камень Сіманава).

Магілёў: Мікольскі манастыр XVII ст., касьцёл XVIII ст. з росьпісамі, Дом Саветаў, гістарычная забудова, музэй на выбар (краязнаўчы, этнаграфічны, мастацкі...), пешаходная вуліца, Палыкаўская сьвятая крыніца.

Кошт — 18 000 руб. для дзяцей і 21000 руб. для дарослых.

Тэлефануйце: 222-88-76, 755-03-70; http://altusplus.narod.ru

**9—12** **ліпеня**

**(а таксама 30 ліпеня — 2 жніўня)**

**запрашаем у вандроўку**

**«Золота Підкова» Львоўшчыны**

**Менск—Жоўква—Крэхіў—Львоў—Алеск—Падгорцы—Золачыў—Сьвірж—Менск**

Кошт вандроўкі: для дарослых — 45 у.а. + 15000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. +15000 руб.

Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі 0,1—0,5 у.а.).

Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўналетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абаіх бацькоў.

Т.: 8-029-551-30-75, 222-88-76

http://altusplus.narod.ru



**Запрашаем на падарожжа**

**27** **чэрвеня (нядзеля)**

**«Браслаўскі край».**



Маршрут: Менск—Глыбокае—Удзела—Мосар—Браслаўскія азёры—Слабодка—Браслаў—Опса—Відзы—Менск.

10—11 ліпеня — Кракаў.

Кантакты: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38; 8-029-776-24-35 (Павал).

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Даражэнькі Кандрацьеў Валер!** Усё-такі трэба абавязкова адрадзіць беларускі тэатар. Дык хай дапаможа табе Бог у гэтай справе! Дзяніс

**Andreja Kažemaksa** vinšujuć z paśpiachovym zakančeńniem universytetu. Siabra Vik

### КАНТАКТЫ

**Прывабная беларусачка** не тэлефануе першая. Аднак з задавальньнем пазнаёміцца з файным беларусам. Згода, Арцём? Т.: 280-51-08. Кацярынка

**Пазнаёмлюся** зь цікавай ды жыцьцярадаснай беларусачкай 16—18 гадоў у Менску. Т.: 8-029-757-58-67. Алесь

**Пазнаёмлюся** зь беларускім хлопцам. Электронны адрас: krasval@bk.ru

**Жадаю вывучыць партугальскую** мову. Шукаю тых, хто цікавіцца Партугаліяй, Бразыліяй, Анголай. У.Ш. Т.: 264-80-52

**I am a portuguese author** (poetry/fiction) wanting to exchange mail with writers from Belarus. Jose. E-mail: enduringdarkness@yahoo.com

**Вольскі і «NRM»!** Чаму клеіш расейскамоўныя аб'яўкі? Беларус з Баранавіч

**28 чэрвеня** а 18-й гадзіне адбудзецца ўшанаваньне памяці Янкі Купалы каля магілы паэта на Вайсковых могілках

**Няхай жыве** зборная Латвіі па футболе! Ганьба Чэхіі, Партугаліі ды іншым мафіям у футболе! Заўзятар

**Тым, хто на Казарменным,** — зь Ліды. Прыміце гэтыя два словы падтрымкі і павагі да вас. Схіляюся перад вашай мужнасьцю

### ПРАДАМ/КУПЛЮ

**Набуду ці арандую** віялянчэль. Т.: 233-44-58, 761-88-84

**Прадаецца дом** у г.Ветка. Ёсьць прыродны газ, пуня, склеп, лазьня, надзел 12 сотак. Т.: (02330) 2-20-41

**Бел-чырвона-белыя** сьцягі можна набыць у Віцебску. Розныя памеры, з выявай «Пагоні» і інш. Т.: 8-029-712-83-88

**Прадаю маленькую шафу**, сэрвант, тумбу пад тэлевізар, канапу, усё ўжыванае, танна. Т.: 214-32-55

**Прадам** этналінгвістычны слоўнік «Славянские древности» (т.1, 2) за 110000 рублёў. Т.: 8-029-400-45-91

**Прадам** ці абмяняю «Расейска-крыўскі слоўнік» В.Ластоўскага. Т.: 230-91-53

**Прадам** ці абмяняю «Беларуска-расейскі слоўнік» М.Байкова і С.Некрашэвіча. Т.: 230-91-53

**Прадам** ці абмяняю «Марфэмны слоўнік беларускай мовы», энцыкляпэдычны даведнік «Архітэктура Беларусі». Т.: 230-91-53

**Прадам** ці абмяняю «Беларускую энцыкляпэдыю» (т.: 6—10), «Чырвоную кнігу Беларусі». Т.: 230-91-53

**Куплю** M.Grevisse «Le bon usage», часопіс «Спадчына» (1994, №1, 3). Т.: 230-91-53

**Куплю** манаграфію «Археалёгія Беларусі» (т. 1—2), «Слоўтваральны слоўнік беларускай мовы». Т.: 230-91-53

**Куплю** Я.Баршчэўскага, Яна Чачота зь «Беларускага кнігазбору». Т.: 230-91-53

**Куплю** першы том збору твораў Я.Купалы ў 9-ці тамах. Т.: 230-91-53

**Куплю** «Слоўнік мовы Я.Купалы» (т.1), «Слоўнік мовы Скарыны» (т.1). Т.: 230-91-53

**Куплю** «Статут ВКЛ 1588» (перавыданьне 1989 г.). Т.: 230-91-53

### ПРАЦА

**Курсавыя**, дыплёмныя, рэфэраты па беларускай мове, літаратуры, мэтодыцы. Т.: 238-80-17

**Пераклады** з ангельскай, польскай, французскай, украінскай (якасна, хутка) на беларускую/ангельскую. Уладзь. Т.: 8-029-678-33-38

**РГА «Беларускі ПЭН-Цэнтар» выказвае шчырае спачуваньне Алесю Каску з прычыны сьмерці бацькі.**

**Саюз беларускіх пісьменьнікаў шчыра спачувае Алесю Каску з прычыны сьмерці бацькі.**

Наступны нумар «НН» выйдзе **9 ліпеня**, у пятніцу. У Менску ў продажы — з абеду чацьвярга.

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Анатолю Т. зь Менску.** «Другая сусьветная вайна зь беларускай нацыянальнай пазыцыі»: для артыкулу ён заідэалягізаваны, для ліста ён завялікі, для палемікі ён ні з чым канкрэтным не спрачаецца. Магчыма, проста для іншага выданьня матэрыял.

**Віктару Ш. з Койданава.** Вашым афарызмам не стае запамінальнасьці й трапнасьці, каб стаць афарызмамі.

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фота-рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3515. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 21.00 23.06.2004.

Замова № 3837.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а